

ЯКІЯ ЎСКЛАДНЕННІ АД COVID-19

5



ЧАМУ Ў ПОЛЬШЧЫ АПАГАНЬВАЮЦЬ ХРАМЫ?

10

14 КРАСАВІКА 2021 г. СЕРАДА

№ 69 (29438)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

# МІНСК—БАКУ: НАЙВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ўвечары прыбыў з афіцыйным візітам у Азербайджан. Самалёт беларускага лідара прызямліўся ў міжнародным аэрапорце Гейдар Аліеў, паведамляе БелТА. У аэрапорце кіраўніка нашай дзяржавы сустракалі з усёй належнай пашанай. Адтуль ён накіраваўся на сустрэчу з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым. У нефармальнай абстаноўцы кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі асноўныя пытанні двухбаковых адносін.**

**Асноўныя перагаворы ў вузкім і пашыраным фармаце запланаваны на сёння.**




# Сад яго мары



**Уладзімір СЦЕПАНОВІЧ, жыхар вёскі Варкавічы Слуцкага раёна, доўгі час працуе ў жывёлагадоўлі, але любімай яго справай стала садаводства — на прысядзібным участку, які перайшоў ад бацькоў і дзядоў, ён даглядае сад: садзіць, прышчэплівае, абразае, беліць. Любіць эксперыментаваць, садзіць навінкі беларускіх садаводаў, нават на старой ігрушы прычаранкаваў ажно пяць сартоў, якія прыжыліся і даюць ураджай. У асартыменце варкавіцкага садавода — яблыні і персікі, абрыкосы і вінаград, сліва, вішня і чарэшня, але грушы — найбольшае захапленне Уладзіміра Іванавіча. У гэты вясновы сезон свой вольны час ён з ахвотай прысвячае любімаму саду.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«У сакавіку бягучага года Навукова-даследчы эканамічны інстытут Мінэканомікі апытаў кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў розных формаў уласнасці. Мы ахапілі каля 80 % прамысловай вытворчасці. Агульны вынік: бізнес дэманструе рост пазітыўных чаканняў. Індэкс прамысловага аптымізму ўпершыню за 12 гадоў перайшоў у станоўчую зону. Гэта значыць, пазітыўных адказаў стала больш, чым негатыўных».*

Парламенцкі дзённік

# Прыярытэтны кірунак знешняй палітыкі

**Менавіта так назваў развіццё адносін з КНР старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се СЯОЮНАМ.** СТАР. 2

Домік у вёсцы

# СЯЛЯНКА ДЫ ШЛЯХЦЯНКА З «ВАСІЛЬКОВА»

## Жыхары Кобрына аднавілі бабуліну хату ў вёсцы і ствараюць аграсядзібу



**Сужэнцы ЖАРЫН і старшыня сельвыканкама Іван БУДЗЬКО *(пасярэдзіне)*.**

**Яшчэ некалькі гадоў таму Людміла і Уладзімір Жарын былі звычайнымі жыхарамі райцэнтра, гараджанамі ў першым пакаленні. Працавалі, гадавалі дзяцей — жылі як усе. У вёску выбіраліся хіба на выхадныя, калі трэба было нешта дапамагчы. У родных Кісялёўцах не забывалі і бабуліну хату, абкошвалі, падтрымлівалі ў парадку. І служыла яна месцам адпачынку сям'і — дачай. Да пары.**

### Ведаць і шанаваць

— Потым дзеці выраслі, часу стала больш, энергія і сілы яшчэ засталіся, — расказвае Людміла Васілеўна. — Захацелася паспрабаваць нешта сваё, знайсці такую справу, якая прыносіла б задавальненне і давала пэўны прыбытак. Спачатку мы сталі прыводзіць у парадак гэтую невялічкую хату. Па першым часе запрашалі ў госці толькі сваіх знаёмых, сяброў. Людзі прыязджалі адпачыць на прыродзе, расказвалі сваім знаёмым, тыя — сваім. Так з'явіліся першыя кліенты, а з імі — кволы намер уладкаваць нешта накшталт аграсядзібы. СТАР. 3

Сацыяльны вектар

# «Мы імкнёмся да максімальнай адкрытасці»

## У сталіцы працуе кансультацыйна-аналітычны аддзел Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва



**Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў многіх асацыюецца выключна з выплатай пенсій. На самай справе яго функцыі значна шырэйшыя. Як працуе фонд, як узаемадзейнічае з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі, расказаў першы намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН Юрый РЭБКАВЕЦ.** СТАР. 2

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Генсек ААН прапанаваў праграму дзеянняў па пераадоленні наступстваў пандэміі

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш прапанаваў праграму дзеянняў з шасці пунктаў, якая накіравана на пераадоленне наступстваў пандэміі COVID-19. Аб гэтым паведаміў Цэнтр навін ААН. Генсек згадаў трагічныя лічбы, якія сведчаць аб маштабных наступствах пандэміі: 3 млн памерлых, 255 млн страчаных рабочых месцаў, 120 млн людзей, якія апынуліся за рысай беднасці, вельмі цяжкая за апошнія 90 гадоў рэцэсія, 170 млн дзяцей, пазбаўленых магчымасці вучыцца, рост няроўнасці паміж краінамі і ўнутры іх. «Але ж крызіс далёкі ад свайго завяршэння, — папярэдзіў Антоніу Гутэрыш. — Хуткасць распаўсюджвання інфекцыі толькі ўзрастае». Каб спыніць гэтую небяспечную тэндэнцыю і пазбегнуць доўгатэрміновай рэцэсіі, неабходна праявіць адзінства і салідарнасць, перакананы кіраўнік ААН. «Пакуль можна сказаць, што мы правалілі экзамен», — заявіў ён. Генсек адзначыў, што вакцыны павінны быць даступныя кожнаму. Трэба выдзеліць ільготнае фінансаванне краінам, якія маюць вострую патрэбу ў падтрымцы. Пры гэтым сродкі неабходна размяркоўваць справядліва.

### Егіпет канфіскаваў кантэйнеравоз Ever Given да выплаты кампенсацыі



Суд егіпецкага горада Ісмаілія па эканамічных справах пастанавіў накласці арышт на кантэйнеравоз Ever Given, які 23 сакавіка парушыў суднаходства па Суэцкім канале на шэсць дзён, пакуль яго ўладальнікі не выплацяць кампенсацыю ў памеры 900 мільёнаў долараў. Аб гэтым паведаміла газета Shorouk News. Адміністрацыя канала абапіраецца на артыкул егіпецкага закона аб марскім гандлі, які дазваляе канфіскаваць судны. У суму кампенсацыі былі ўключаны як выдаткі адміністрацыі канала за зняцце Ever Given з мелі, так і страты канала з-за яго блакавання. Паводле даных лонданскай фінансавай кампаніі Refinitiv, егіпецкая дзяржава пазбавілася транзітных збораў на суму 95 мільёнаў долараў.

### Брытанскі прэм'ер вырашыў здаць у арэнду свой дом



Брытанскі прэм'ер-міністр Борыс Джонсан вырашыў здаць свой катэдж у графстве Оксфардшыр. Аб гэтым паведаміла The Times са спасылкай на агенцтва нерухомасці Strutt & Parker, якое размясціла аб'яву. Кошт арэнды складзе €4250 (каля $5800) у месяц. У доме ёсць чатыры спальні, басейн і тэнісны корт, гаворыцца ў аб'яве. У ёй таксама пазначана, што мінімальны тэрмін арэнды складае 12 месяцаў. Мяркуючы па фатаграфіях, дом здаецца без мэблі. У аб'яве гаворыцца, што магчымае пражыванне з дамашнімі жывёламі. Кошт асабняка складае каля €1,2 млн (амаль $1,65 млн), адзначыла Daily Mail. Паводле звестак выдання, Джонсан купіў гэты дом у 2003-м разам са сваёй былой жонкай за €690 тысяч (амаль $950 тысяч). З 2019 года Джонсан жыве ў чатырохпакаёвай рэзідэнцыі прэм'ера на Даўнінг-стрыт са сваёй нявестай Кэры Саймандс.

ISSN 1990 - 763X

21069>
9 771990 763008

## КОРАТКА

- У Беларусі ўведзена часовая санітарная мера па забароне ўвозу і звароту асобных найменняў парфумерна-касметычнай прадукцыі гандлёвага знака Nivea.
- **Новы дзіцячы садок адкрыюць у шматпавярхоўцы Брэста 15 красавіка.**
- Ізраіль плануе дазволіць уезд вакцынаваным турыстам з 23 мая.
- **Беларускі саюз жанчын напярэдадні 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны аб'яўляе акцыю «Я, мы памятаем!»**
- Новы жылы раён пабудуюць у Мікашэвічах.
- **Каля 1,5 тысячы вакансій прапануецца ў сельскай, рыбнай і лясной гаспадарцы Віцебскай вобласці.**
- Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту ў I квартале склаў каля Br1,7 млрд.

Добрая навіна

# ФРАНЦУЗСКІЯ ВАНТЫ Ў ЛЮСТРЫ ДНЯПРА

## Унікальны мост стане візітоўкай Рагачова



Фота Раісы БОРАВАЙ.

**Незвычайны па архітэктуры пуцеправод ужо ахрысцілі самым прыгожым у Беларусі. Транспартны трафік па новым мосце, магчыма, адкрыецца ўжо сёлета.**

### ЭПІЦЭНТР МОСТАБУДОЎЛІ

Мост на Рагачоўшчыне злучае дзве часткі вялікага раёна (прыкладна 200 вёсак), што падзяліў Дняпро. Пуцеправод на гэтым кірунку аб'ядноўвае рэспубліканскія трасы М5 і М8, якія з'яўляюцца часткамі еўрапейскага аўтамабільнага маршруту.

Стан старога моста, пабудаванага ў 1959 годзе, выклікаў заклапочанасць спецыялістаў. Яго вонкава масіўныя бетонныя апоры разбураліся, арматуру «паела» карозія, у канструкцыі пралётаў пачаліся крытычныя прагіны. Было прынята рашэнне аварыйны мост закрыць, пачаць яго дэмантаж. Летась у сярэдзіне сакавіка ў Рагачове наладзілі аб'язную дарогу па часовай жалезнай пераправе. Паралельна маставікі прыступілі да рэканструкцыі галоўных варотаў горада, якія больш за паўстагоддзя звязвалі берагі Дняпра.

Адкрыццё часовай пераправы ў кароткі тэрмін забяспечылі вайскоўцы 36-й дарожна-маставой брыгады. Устанавілі вялікі аўтадарожны разборны мост грузападымальнасцю 60 тон. Калі ж асноўны мост будзе пабудаваны, «дублёра» разбяруць і змогуць выкарыстоўваць на іншых падобных аб'ектах. СТАР. 3

Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество**
**«Банк роста и развития бизнеса»**
220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18
**www.rrb.by**

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 23 071 | 21 622 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 42 654 | 42 055 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 22 774 | 28 935 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 37 749 | 39 338 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 262 847 | 259 573 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 25 299 | 25 514 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 327 | 187 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 1 | 1 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 4 419 | 4 477 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 419 141 | 421 702 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 15 176 | 15 993 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 348 251 | 340 414 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 3 446 | 13 610 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 669 | 2 527 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 369 542 | 372 544 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 8 990 | 8 758 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 9 452 | 9 452 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 10 728 | 10 519 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 49 599 | 49 158 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 419 141 | 421 702 |

Форма 2

## ОТЧЕТ
**о прибылях и убытках**
на 1 апреля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2021 | 01.04.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 774 | 4 978 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6 400 | 3 301 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 374 | 1 677 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 4 307 | 2 132 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 549 | 320 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 758 | 1 812 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (208) | (54) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 979 | 941 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 312 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 768 | 1 306 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 343 | 389 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4 755 | 2 869 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 260 | 111 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 463 | 791 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 22 | 141 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 441 | 650 |

И.о. Председателя Правления
Заместитель Председателя Правления Д.В.Клименков

Главный бухгалтер Н.Н.Мостыко

Дата подписания: 2 апреля 2021 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 22 июня 2020 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Горняк» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1 (повторный):**

**- здание главного корпуса винодельческого завода, склад готовой продукции** *(составные части и принадлежности: кирпичное здание главного корпуса винодельческого завода, склада готовой продукции Б1-2/к, с навесом 1)*, **инв. № 644/С-50968, общая площадь 1243,1 кв. м;**

**- здание автогаража** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание автогаража – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50958, общая площадь 130,1 кв. м;**

**- здание насосной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание насосной Б1/к, подземная часть (Б1/к), пристройка 1)*, **инв. № 644/С-50959, общая площадь 19,7 кв. м;**

**- здание склада соков** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада соков Б1/к)*, **инв. № 644/С-50967, общая площадь 113,2 кв. м;**

**- здание заводоуправления** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание заводоуправления – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50961, общая площадь 91,2 кв. м;**

**- здание конторы** *(составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание конторы Б2/к)*, **инв. № 644/С-50957, общая площадь 233,9 кв. м;**

**- здание проходной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание проходной Б1/к)*, **инв. № 644/С-50960, общая площадь 30,1 кв. м;**

**- здание консервного цеха** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание консервного цеха – Б/1/к)*, **инв. № 644/С-50956, общая площадь 891,3 кв. м;**

**- здание котельной** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50955, общая площадь 193,1 кв. м;**

**- здание спиртохранилища** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание спиртохранилища – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50953, общая площадь 148,9 кв. м;**

**- здание насосной с водонапорной башней** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание насосной с водонапорной башней – Б1/к)*, **инв. № 644/С-50963, общая площадь 15,3 кв. м;**

**- здание склада запчастей** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада запчастей Б1/к, навес 1, крыльцо)*, **инв. № 644/С-50966, общая площадь 408,5 кв. м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000312 площадью 2,2471 га (право аренды по 22.04.2043) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-2, ул. Центральная, 18А.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: водоохранная зона Солигорского водохранилища, пл. 2,2417 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 259 872,48** бел. руб. *Цена снижена на 20 %.* Задаток 10 % от начальной цены (**25 987,00** бел. руб.).

**Лот № 2:**

**Самоходный зерноуборочный комбайн (категория D) КЗС-10К-13 «Полесье», 2007 года выпуска, заводской № 1724, двигатель – ЯМЗ-238БК-2, № 70320590, регистрационный № ОМ-5 3251, изготовитель – Республика Беларусь, расположенный по адресу: Минская область, Солигорский район, аг. Жабин, ул. Победы, 2.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 37 301,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**3 730,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в его условиях **18.05.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.05.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (0174) 209 206, 8 (044) 783 82 52.**

УНП 600071102

# Прыярытэтны кірунак знешняй палітыкі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спікер ніжняй палаты парламента выказаў спадзяванне, што дыпламат з пачатку сваёй работы ў Беларусі ў лістападзе ўпэўніўся ў сімпатыі і шчырасці адносін беларусаў да Кітая. «Я хацеў бы адзначыць, што развіццё адносін з Кітайскай Народнай Рэспублікай — гэта прыярытэтны кірунак знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У нас вельмі даўнія сяброўскія сувязі, якія дазваляюць вырашаць нам практычна ўсе пытанні і весці супрацоўніцтва па многіх кірунках», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён заўважыў: аснову ўзаемадзеяння краін складаюць кантакты кіраўнікоў дзяржаў, якія абмяркоўваюць важныя пытанні — нарошчванне паставак харчовай прадукцыі, хлорыстага калію ў Кітай, паглыбленне кантактаў рэгіёнаў, барацьбу з ковідам.

Па словах спікера ніжняй палаты парламента, за мінулыя гады складалася магутная дагаворна-прававая база ўзаемадзеяння па многіх напрамках. Краіны сёння ўзаемадзейнічаюць таксама на разнастайных міжнародных парламенцкіх пляцоўках.

Кітай Уладзімір Андрэйчанка назваў вядучай краінай свету, дзе шмат зроблена дзякуючы працалюбіваму народу, яго адзінству, еднасці.

«Я думаю, што адносіны сяброўства, падтрымкі, узаемаразумення паміж нашымі дзяржавамі захаваюцца ў будучым. І сёння мы перажываем вельмі няпростыя часы. Нам важна цяпер кансалідаваць свае намаганні, выходзіць на маштабныя праекты, каб паказаць неэфектыўнасць санкцый, дыктату, якія прымаюцца з боку асобных дзяржаў супраць Беларусі і супраць КНР», — дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Се Сяоюн, у сваю чаргу, падкрэсліў, што кітайска-беларускае стратэгічнае партнёрства і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва развіваюцца стабільна і плённа, а кантакты падтрымліваюцца на высокім і вышэйшым узроўнях.

«Мы з вамі падтрымліваем вельмі цеснае і плённае ўзаемадзеянне ў міжнародных справах. Мы абараняем адно аднаго па тых пытаннях, што датычацца нашых асноўных інтарэсаў. Можна сказаць, што наша міжнароднае ўзаемадзеянне сёння з'яўляецца яскравым сведчаннем нашага супрацоўніцтва», — сказаў пасол.

Ён нагадаў пра значныя сумесныя дасягненні краін ў эканоміцы, гандлі, інвестыцыях, навуцы, культуры, адукацыі і барацьбе з каранавірусам.

Пасол адзначыў, што менавіта заканадаўчая работа мае важнае значэнне ў развіцці супрацоўніцтва ў розных галінах, паколькі без прававой асновы немагчыма ісці далей.

Таксама кіраўнік знешнепалітычнага прадстаўніцтва Кітая ў Беларусі заявіў, што КНР падтрымлівае нашу краіну ў абароне суверэнітэту і незалежнасці.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Мы імкнёмся да максімальнай адкрытасці»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Адразу хачу растлумачыць, чым адрозніваецца Фонд сацыяльнай абароны ад упраўленняў сацыяльнай абароны ў раённых адміністрацыях, — уводзіць у курс справы Юрый Іванавіч. — Асноўнымі задачамі раённых аддзелаў Фонда з'яўляюцца збор абавязковых страхавых узносаў і ўзносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне. А таксама кантроль за паўнатой і своечасовасцю іх выплаты, вядзенне персаніфікаванага ўліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, кантроль за правільнасцю прызначэння і своечасовасцю выплаты дапамог па лістку непрацаздольнасці, па цяжарнасці і родах, а таксама дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Раённыя ж упраўленні сацыяльнай абароны ў Мінску займаюцца прызначэннем і выплатай пенсій па ўзросце; па інваліднасці; па страце карміцеля; за асаблівыя ўмовы працы; выплатай дапамогі на пахаванне; прызначэннем і выплатай дзяржаўных дапамог сем'ям непрацуючых грамадзян, якія выхоўваюць дзяцей; аказваюць адрасную сацыяльную дапамогу.

***— Кожны чалавек, які працуе, бачыць у сваім разліковым лістку пазіцыю: ФСАН —1 % ад заробку. Яшчэ мы ведаем, што наймальнік плаціць у дадзены фонд 34 % за кожнага работніка. Як размяркоўваюцца гэтыя грошы?***

— На патрэбы пенсійнага забеспячэння ідуць наш 1 % і 28 %, выплачаных працадаўцам. Гэтыя грошы выдаткоўваюцца на пенсіі нашым бацькам, дзядулям, бабулям. З гэтых жа сродкаў выплачваюцца пенсіі па страце карміцеля і па інваліднасці. Яшчэ 6 % — узнос на сацыяльнае страхаванне, то-бок аплата «бальнічных», «дэкрэтных» і ўсіх відаў дзіцячых дапамог, выплаты на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, дапамог па беспрацоўі, выплаты на пахаванне.

***— Нядаўна была сведкай гутаркі дзвюх маладых жанчын, адна з якіх сцвярджала, што яе прымуць на работу пры ўмове, што яна не пойдзе ў дэкрэт у найбліжэйшыя пяць гадоў. А калі не выканае гэтую ўмову, то наймальнік не будзе плаціць ёй «дэкрэтныя» і дапамогу на дзіця. Атрымліваецца, не ўсе ведаюць, што гэтыя грошы плаціць ФСАН. У сувязі з гэтым пытанне: як наладжана інфармаванне грамадзян аб рабоце фонду?***

— Добрае пытанне. Тэма інфармавання, кансультацый за апошні час стала настолькі запатрабаваная, што ў канцы 2019 года на базе Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН стварылі кансультацыйна-аналітычны аддзел, які працуе па прынцыпе «кампетэнтна, лёгка і зручна». Аддзел знаходзіцца ў памяшканні на вуліцы Талбухіна, 6. Тут вялікая аперацыйная зала, наведвальнікаў абслугоўваюць па электроннай чарзе. Арганізаваны рабочыя месцы для экспрэс-прыёму, то-бок кансультавання грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Мы нават паклапаціліся аб тым, каб быў «дзіцячы куток» — пакуль бацькі занятыя, дзіця можа маляваць і чытаць. Калі пажылому чалавеку будзе цяжка сарыентавацца, да каго звяртацца, або ўзнікнуць праблемы з выкарыстаннем тэрмінала, на дапамогу прыйдзе адміністратар залы. Акрамя таго, узоры запаўнення дакументаў размешчаны на інфармацыйных стэндах.

Да візіту ў кансультацыйны аддзел можна падрыхтавацца, папярэдне вывучыўшы інфармацыю на афіцыйным сайце фонду ssf.gov.by, а таксама на відэахостынгу YouTube і ў сацыяльных сетках. Акрамя таго, у кансультацыйна-аналітычным аддзеле працуе шматканальны тэлефон +375 17 352 05 01. Такі від сувязі, перш за ўсё, зручны для іншагародніх, таму што наш аддзел абслугоўвае грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў усёй краіны. Мы імкнёмся да максімальнай адкрытасці, таму хачу заклікаць вашых чытачоў атрымліваць інфармацыю з першакрыніцы.

***— Юрый Іванавіч, можаце назваць топ пытанняў, з якімі звяртаюцца грамадзяне?***

— Самая запатрабаваная паслуга для грамадзян — выдача звестак з індывідуальнага асабовага рахунку. Па атрыманне гэтых звестак звярнулася 1855 фізічных асоб. Таксама кансультацыйна-аналітычны аддзел апрацоўвае запыты па падрыхтоўцы і выдачы звестак аб выплаце ўзносаў у бюджэт фонду да 2003 года пры разглядзе судамі спраў па пытанні ўстанаўлення памеру атрыманага заробку, неабходнага для прызначэння пенсіі. У судовыя органы накіравана 3284 адзінкі такіх звестак. Зноў жа, узнікаюць пытанні па правільнасці прызначэння і своечасовасці выплаты ўсіх відаў сацыяльных дапамог.

У цэлым, вельмі шмат зваротаў па розныя даведкі, датычныя выплаты страхавых узносаў. Звяртаюцца да нас па кансультацыі самазанятыя грамадзяне, якія думаюць пра сённяшнія сацыяльныя гарантыі і пра сваю будучую пенсію.

Цяпер менавіта ў гэтым аддзеле ажыццяўляецца пастаноўка на ўлік плацельшчыкаў страхавых узносаў, выдаюцца пасведчанні незалежна ад месца рэгістрацыі грамадзяніна, які звярнуўся.

***— А што цікавіць прадстаўнікоў юрыдычных асоб і ІП?***

— У нас ёсць адказы на ўсе пытанні, пачынаючы з парадку рэгістрацыі ў якасці плацельшчыкаў абавязковых страхавых узносаў у органах фонду. Шмат узнікае пытанняў па правільнасці налічэння і парадку выплаты абавязковых страхавых узносаў, узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне; правільнасці прызначэння і выплаты ўсіх сацыяльных дапамог. Таксама запатрабаваныя кансультацыі па афармленні справаздачнасці, у тым ліку з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій.

***— Як паўплывала на работу кансультацыйна-аналітычнага аддзела неспрыяльная эпідэмічная сітуацыя?***

— Летась асабліва запатрабаваныя аказаліся паслугі па персанальным кансультаванні ў фармаце тэлефонных званкоў і адказаў на пісьмовыя і электронныя звароты плацельшчыкаў. Па растлумачэнне заканадаўства звярнулася больш за 35000 юрыдычных і фізічных асоб. Для тых, хто хоча вочна атрымаць кансультацыю, у зале ёсць дэзынфектары, адміністратар сочыць за выкананнем сацыяльнай дыстанцыі. Нашы спецыялісты працуюць у масках, а наведвальнікаў без такога сродку аховы не абслугоўваюць.

Паколькі бухгалтарскія службы шматлікіх арганізацый перайшлі на аддаленую работу, мы ў 2020 годзе правялі 204 семінары і навучальныя заняткі па складанні справаздач і звестак персаніфікаванага ўліку з выкарыстаннем праграмных комплексаў. І ў далейшым плануем актыўна развіваць дыстанцыйныя формы работы, у прыватнасці, праводзім вэбінары для плацельшчыкаў страхавых узносаў — у першым квартале 2021 года іх прайшло ўжо 115. Таксама ствараем навучальныя ролікі і размяшчаем каментарыі па найбольш актуальных пытаннях дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на афіцыйным сайце фонду і ў сацыяльных сетках.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению республиканского производственного унитарного предприятия «Завод точной электромеханики» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1: автобус, вагон VOLKSWAGEN CARAVELLE, год выпуска – 2013, полная масса – 3200 кг, пассажирских мест – 9, экологический класс – 5, регистрационный номер АН 8231-5, индентификационный номер VIN № WV2ZZZ7HZEH037216, двигатель – дизельный с рабочим объемом 2,0 л, пробег (по одометру) – 218871 км, цвет – черный, находится по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 2/1.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 40 165,20** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **4 016,52** бел. руб.

**Лот № 2: автобус, вагон «RENAULT MASTER АПС МА 2025», год выпуска – 2014, полная масса – 4500 кг, пассажирских мест – 20, экологический класс – 4, двигатель – дизельный с рабочим объемом 2,3 л, идентификационный номер VIN № VF1MAF6CK50652183 Y39MA2025E0115091, регистрационный номер – АО 3750-5, цвет – темно-синий, находится по адресу: Минская область, Дзержинский район, Станьковскийс/с, д. Станьково, ул. Войсковая, 24/1.**

Начальная цена с НДС(20 %) **– 37 446,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **3 744,60** бел. руб.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB3012 1082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **13.05.2021** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.05.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (017) 318 90 19; 8 (029) 882 49 63.**

УНП 690653077

Папрацуем!

# ВЯСЕННІ СУБОТНІК,

## ці Як навесці парадак бяспечна

**У Беларусі 17 красавіка аб'яўлены суботнік. Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 красавіка 2021 г. № 206 «Аб правядзенні рэспубліканскага суботніка ў 2021 годзе», рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, іншым арганізацыям рэкамендавана на добраахвотнай аснове правесці рэспубліканскі суботнік на рабочых месцах або ажыццявіць добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан аб'ектаў і тэрыторый населеных пунктаў, гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мемарыяльных комплексаў, мясцін баявой і воінскай славы часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны нагадваюць, што пры правядзенні суботніка наймальнік абавязаны забяспечыць у поўным аб'ёме выкананне сваіх абавязкаў, прадугледжаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове працы» і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

У выпадку, калі падчас суботніка работнік будзе працаваць на сваім рабочым месцы, забеспячэнне здаровых і бяспечных умоў працы павінна ажыццяўляцца ў звычайным рэжыме.

Калі ж работнік падчас правядзення суботніка працуе не на сваім рабочым месцы (прыцягваецца да выканання разавых работ, не звязаных з прамымі абавязкамі), удзельнічае ў добраўпарадкаванні і прывядзенні ў належны стан аб'ектаў і тэрыторый населеных пунктаў, гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мемарыяльных комплексаў, мясцін баявой і воінскай славы часоў Вялікай Айчыннай вайны, то абавязковай умовай па допуску работнікаў да работы з'яўляецца правядзенне з імі мэтавага інструктажу па ахове працы па той разнавіднасці работы, якую ён выконвае.

Пры выкананні работ па добраўпарадкаванні населеных пунктаў мэтавы інструктаж па ахове працы праводзіцца непасрэдным кіраўніком работ наймальніка, а пры выкананні работ на тэрыторыі іншай арганізацыі — непасрэдным кіраўніком работ або спецыялістам арганізацыі, на тэрыторыі якой будуць праводзіцца работы.

Неабходна не дапускаць да выканання работ людзей у выпадку пагаршэння іх самаадчування, звязанага з прастуднымі захворваннямі, з прыкметамі хваробы. З улікам эпідэмічнай сітуацыі, пры арганізацыі работ па суботніку неабходна ўлічваць рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя, а таксама не дапускаць да выканання работ людзей у хваравітым стане. Для ўстанаўлення падобных фактаў неабходна правесці апытанне работнікаў аб стане іх здароўя пры правядзенні мэтавага інструктажу.

Нельга дапускаць работнікаў, якія не маюць адпаведнай падрыхтоўкі, да выканання работ з павышанай небяспекай. Таксама на дазваляецца працаваць работнікам, якія не забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы. Важна забяспечыць захаванне нормаў падняцця і перамяшчэння цяжараў уручную жанчынамі, якія бяруць удзел у суботніку.

Наймальнік абавязаны пры выкананні работ па добраўпарадкаванні і прывядзенні ў належны стан населеных пунктаў забяспечыць работнікаў інструментам і неабходным інвентаром, сродкамі індывідуальнай аховы (пальчаткамі або рукавіцамі, пры рабоце на праезнай частцы — сігнальнымі камізэлькамі, пры рабоце на будаўнічым аб'екце — ахоўнымі каскамі).

Калі выкананне работ ажыццяўляецца на тэрыторыі іншай арганізацыі, работнікі забяспечваюцца сродкамі індывідуальнай аховы і інструментам па дамоўленасці паміж наймальнікам і прымаючым бокам.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И П О В Т О Р Н О Г О А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» в составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальные строения (прирельсовый склад хранения лаков и красок, инв. № 610/С-53946, общая площадь – 424,3 м²), капитальное строение (станция перекачки, инв. № 610/С-53944, общая площадь – 41,8 м²)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001118 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, корп. 10 | 15 250,00 | 1 525,00 |
| 2 | **Капитальное строение (электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная, инв. № 610/С-53929, общая площадь – 639,2 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17 | 27 150,00 | 2 715,00 |
| 3 | **Капитальное строение (здание трансформаторной подстанции, инв. № 610/С-53943, общая площадь – 350,1 м²), капитальное строение (низконапорная станция перекачки сточных вод, инв. № 610/С-53941), сооружение (труба дымовая кирпичная, инв. № по бух. учету 20014**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002774 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36 | 37 980,00 | 3 798,00 |
| 4 | **Капитальное строение (пост приема и выдачи нефтепродуктов, инв. № 610/С-53945, общая площадь – 47,3 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002786 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/8 | 2 000,00 | 200,00 |
| 5 | **Капитальное строение (сушильно-раскроечный цех, общая площадь – 2023,5 м²),** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36Г | 47 850,00 | 4 785,00 |
| 6 | **Капитальное строение (газораспределительный пункт, общая площадь – 35,7 м², инв. № по бух учету 40029/2),** расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/1 | 2 550,00 | 255,00 |

Стоимость снижена на 50 %.

В соответствии с абзацем 4 п. 1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

На Покупателя (Победителя торгов, Единственного участника) каждого лота (№ № 1–6), выставленного на торги по продаже недвижимого имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» (Продавца), возлагается обязательство по принятию на хранение движимого имущества Продавца, находящегося в приобретаемых объектах, на срок до его реализации или утилизации. Хранение осуществляется без взимания платы. Приемка и возврат принятого на хранение имущества удостоверяется актами приема-передачи имущества, являющимися неотъемлемой частью договора купли-продажи. В период хранения Покупатель обязуется обеспечить представителям Продавца свободный доступ к движимому имуществу, переданному на хранение.

На Покупателя/Покупателей лота № 2 возлагается обязанность по обеспечению свободного доступа к РУ, РП и линиям, исходящим от них, находящиеся в приобретаемых Объектах и на соответствующих земельных участках, для сотрудников энергоснабжающей организации, а также обязанность по обеспечению полного ограничения доступа к РУ, РП и линиям, исходящим от них, для третьих лиц по правилам технической и энергетической безопасности.

По объектам сушильно-раскроечный цех, составляющий лот № 5, и газораспределительный пункт, составляющий лот № 6, отсутствует государственная регистрация, а также он находится в аварийном состоянии. По объекту труба дымовая кирпичная, включенному в лот № 3, отсутствуют какие-либо документы.

Так как объекты, содержащиеся в лоте № 2 и лоте № 3, являются частями энергоснабжающей системы, условием заключения договора с Покупателем любого из указанных лотов будет обязанность по покупке другого лота. Кроме того, на данного Покупателя возлагается дополнительная обязанность по приобретению (заключению договора купли-продажи) единого энергоснабжающего комплекса ОАО «БПМИ» (включающего трансформаторы, камеры КСО, РУ, РП, КЛ и хозяйство электросиловое) общей стоимостью 945,90 бел. руб. в течение 30 банковских дней после заключения договора купли-продажи объектов по лотам № 5 и № 6. С полным списком имущества, входящего в единый энергоснабжающий комплекс, можно ознакомиться у антикризисного управляющего – ЧПУП «Аналитик-центр» (тел. для справок: 8 (017) 378-05-66, адрес эл. почты: analitik-centr@tut.by).

Газораспределительный пункт, составляющий лот № 6, располагается на земельном участке с кадастровым номером 640400000008000182 совместно с капитальным строением (бойлерной) и сооружением (навесом для ПВМ), реализованными ранее в рамках дела о банкротстве ОАО «БПМИ».

Сушильно-раскроечный цех, составляющий лот № 5, располагается на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 совместно с капитальным строением (насосной станцией 2-го подъема), реализованным ранее в рамках дела о банкротстве ОАО «БПМИ».

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB3012 1082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона.**

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата за размещение сведений о торгах в СМИ;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 29.01.2021, 06.03.2021, 31.03.2021.

Аукцион состоится **29.04.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.04.2021** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

Дзеля памяці

# ЗАМАЎЧАЎ «ЗАЛАТЫ» ГОЛАС

**Краіна развітваецца з легендарным песняром Леанідам Барткевічам**



«Няма таго, што раньш было...», «Бывай, абуджаная сэрцам дарагая...», «Александрына, цяпер прыйшла зіма», «Я к тебе прилетаю, Беловежская пуща»... Гэтыя песенныя радкі заўсёды будуць гучаць для нас голасам аднаго з «Песняроў» Леаніда Барткевіча. Бо хто чуў яго непараўнальнае выкананне, запомніў назаўсёды.

Цяпер яго «залаты», чысты і звонкі беларускі голас будзе чутны толькі ў запісах... 13 красавіка, на 72-м годзе жыцця, спявак памёр.

У легендарны ансамбль «Песняры» Барткевіч трапіў па запрашэнні Уладзіміра Мулявіна ў 1970-м годзе... Было Леаніду ўсяго дваццаць адзін. Вядома, да гэтага шукаў сябе... Хоць музыка суправаджала заўсёды — быў салістам у хоры хлопчыкаў Палаца піянераў у родным Мінску, салістам харавога ансамбля «Юнацтва» пры кансерваторыі, скончыў музычную школу па класе трубы. Зразумела, засвоіў і модную гітару... Але паралельна прайшоўся па архітэктурнай дарозе — дарэчы, дыпломная праца Леаніда Барткевіча, выпускніка Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума, была прысвечана кінатэатру «Кастрычнік» у Мінску: будучы слынны спявак удзельнічаў у яго праектаванні.

«Я ніколі нікога не капіраваў. Вельмі любіў спевы вялікага Сяргея Лемешава, а ягоны зварот да маладых выканаўцаў, аднойчы пачуты па радыё, стаў галоўным ключом майго стаўлення да песні на ўсё жыццё. Ён тады сказаў: «Трэба любіць песню ў сабе, а не сябе ў песні!»

Гэты запавет Леанід Барткевіч захоўваў усё жыццё.

Харызматычны, прыгожы, сапраўдная «зорка», Барткевіч заўсёды знаходзіўся ў цэнтры ўвагі, да таго ж быў здольны на смелыя, нечаканыя ўчынкі. Напрыклад, дзесяць гадоў прапрацаваўшы ў «Песнярах», на піку славы, паступіў у маскоўскі Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва на рэжысёрскае аддзяленне... Мала хто ўяўляў, якім славуты спявак быў у жыцці. Аднойчы ў гутарцы, запісанай ужо пасля смерці Мулявіна, Барткевіч сказаў: «Сёння я слухаю толькі класіку і «The Beatles». Жыву сённяшнім днём і заўтрашнім. Я не разумею, як сёння людзі жывуць у дэпрэсіі. Калі, напрыклад, мне кепска, я знаходжу занятак па душы: засцілаю більярдны стол, пішу карціны, адпраўляюся з сябрамі на рыбалку ці ў грыбы».

Але, безумоўна, з вялікім спеваком і ў светлыя, і ў цёмныя хвіліны была яго песня, якую мы будзем слухаць заўсёды.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

На слыху

# ЧАРГОВАЯ ХВАЛЯ?

**У краіне расце колькасць захварэлых на інфекцыю COVID-19**

**Спецыялісты ў рэгіёнах і Мінску канстатуюць рост захворвання інфекцыяй COVID-19, у тым ліку пнеўманіямі каранавіруснага паходжання з цяжкім цячэннем, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

Па звестках дазорнага эпідэміялагічнага назірання, частата выяўлення РНК віруса SARS-CoV-2 (ПЦР) ва ўзорах за 14-ы каляндарны тыдзень 2021 года склала 11,9 %. У сувязі з гэтым санітарна-эпідэміялагічная служба краіны актывізуе работу па правядзенні эпідрасследавання кожнага выпадку захворвання інфекцыяй COVID-19 і кантактаў першага ўзроўню. Таксама ў цэнтры ўвагі кантроль за арганізацыяй і правядзеннем санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў у арганізацыях і на прадпрыемствах. Тэхнічным спецыялістам пастаўлена задача пераправерыць работу ўсіх кіслародных станцый, наяўнасць тэстаў, лабараторных матэрыялаў, лекавых сродкаў.

Улічваючы рост захворвання інфекцыяй COVID-19, расслабляцца і ігнараваць рэкамендацыі ўрачоў па захаванні масачнага рэжыму і фізічнага дыстанцыявання не варта. З надыходам цёплага надвор'я як ніколі важна мінімізаваць рызыкі заражэння інфекцыяй. Неабходна скараціць кантакты ў крамах, транспарце, іншых грамадскіх месцах.

**Сведения об аудируемом лице**

**Наименование: «Приорбанк» Открытое акционерное общество**
«Приорбанк» Открытое акционерное общество зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 года, регистрационный № 12.
Местонахождение: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Веры Хоружей, 31А.

**Сведения об аудиторской организации**

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Эрнст энд Янг».
Зарегистрировано 7 апреля 2005 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190616051.
Является членом Аудиторской палаты с 26 декабря 2019 года.
Регистрационный номер записи аудиторской организации в аудиторском реестре – 10051, дата включения в аудиторский реестр – 1 января 2020 года.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 51а, 15-й этаж.


# ОАО «Дорстройиндустрия»
## извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества

| Лот № 1 | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1 | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| | | 28018,54 | 2 800,0 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

**внутризаводская асфальтобетонная площадка № 1** (инвентарный номер 632/С-41830, назначение: сооружение неустановленного назначения, составные части и принадлежности: сооружение внутризаводская асфальтобетонная площадка № 1)

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,0280 га с кадастровым номером 622250600001002027. Назначение земельного участка – земельный участок для размещения объектов иного назначения.
Сведения о наличии ограничений в использовании земельного участка отсутствуют.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 17.05.2021 в 10.00
по адресу: Минская область, Дзержинский район, город Фаниполь, ул. Заводская, д. 1-1, 3-й этаж, актовый зал**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона (Продавцом) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с BY32BAPB30123268800100000000 в ЦБУ № 510 Региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот № 1), **проводимом 17 мая 2021 года.**

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1-1, каб. 202.

Окончание приема заявлений – **13.05.2021 в 17.00.**

Заключительная регистрация участников **17.05.2021 с 09.30 до 10.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта: Мазюкевич Дмитрий Николаевич, 8 (029) 534-99-76.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 555-33-10, 8 (033) 660-70-50 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**



# ООО «СпецРеализация»
## объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926, г. Минск, ул. Л. Украинки, д. 16, каб. 6), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов***: **18 мая 2021 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 14 апреля 2021 года по 14 мая 2021 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926)** в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708179540, назначение – квартира, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Ефросиньи Полоцкой, 5-81, площадь – 55,6 кв. м | **203 000,00** | **5 %** | **5 %** |
| 2 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708179543, назначение – квартира, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Ефросиньи Полоцкой, 5-84, площадь – 55,2 кв. м | **201 000,00** | | |
| 3 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161391, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-126, площадь – 17,8 кв. м | **24 000,00** | | |
| 4 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161392, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-135, площадь – 17,3 кв. м | **24 000,00** | | |
| 5 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161393, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-137, площадь – 16,1 кв. м | **24 000,00** | | |
| 6 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161404, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-149, площадь – 13,2 кв. м | **22 900,00** | | |
| 7 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161398, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-150, площадь – 13,1 кв. м | **22 900,00** | | |
| 8 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161399, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-151, площадь – 13,3 кв. м | **22 900,00** | | |
| 9 | Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161400, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-152, площадь – 13,3 кв. м | **22 900,00** | | |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 17.00 **14 мая 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 14.05.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар!

# Гэты каварны вірус...

## Якія ўскладненні выклікае COVID-19

**Каля чвэрці пацыентаў пасля перанесенага COVID-19 працягвае адчуваць розныя непаладкі ў арганізме — скачкі пульсу і ціску, слабасць і задышку, кашаль, адсутнасць нюху і перапады настрою — праз некалькі тыдняў ды нават месяцаў пасля пастаноўкі дыягназу. Вірус можа нанесці шкоду лёгкім, сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэме, а аднаўленне арганізма займае шмат часу. На якія праявы варта звярнуць увагу і з чым абавязкова неабходна звяртацца да медыкаў, расказала ўрач першай катэгорыі, тэрапеўт медыцынскага цэнтра «ЛОДЭ» Юлія КАЖЭЎНІКАВА.**



***— Юлія Уладзіміраўна, якія асноўныя наступствы каранавіруса? На якія органы і сістэмы ён дае ўскладненні?***

— «Постковідны сіндром» — ужо ўстойлівы і агульнапрызнаны тэрмін, які абазначае наступствы інфекцыі COVID-19, што могуць захоўвацца некалькі тыдняў ці месяцаў пасля хваробы, а ў асобных выпадках — і больш працяглы час. Праявы сіндрому шматлікія: гэта можа быць галаўны боль, незвычайная слабасць, нязвыкла яркія сны, дэзарыентацыя ў часе і прасторы, цяжкая дэпрэсія, перапады настрою, парушэнні тэрмарэгуляцыі, рэгулявання артэрыяльнага ціску, сардэчнага рытму, зроку, слыху, дыхання, менструальнага цыклу, праходжання ежы па страўнікава-кішачным тракце.

Замежныя даследаванні паказваюць, што пацыенты, якія пабылі ў рэанімацыі ў сувязі з вострай дыхальнай недастатковасцю падчас ковіду, даўжэй адчуваюць наступствы хваробы. Напрыклад, такія сімптомы як трывога, расстройства памяці і дэпрэсія, могуць захоўвацца вельмі доўга.

Каранавірусная інфекцыя небяспечная сваёй заразлівасцю і ўскладненнямі, якія ўключаюць вострую дыхальную недастатковасць і паражэнне многіх органаў. Гэта захворванне, якое можа закранаць адразу некалькі з іх: лёгкія, кішэчнік, сэрца, печань, ныркі, а таксама скурныя покрывы, перыферычныя нервы і галаўны мозг.

Разам з тым у кожным асобным выпадку хвароба працякае па-рознаму — у залежнасці ад узросту, стану імунітэту, спадарожных захворванняў. Хтосьці перахварэе і не заўважыць ніякіх змен. У аднаго чалавека ў выніку хваробы можа пацярпець печань, у іншага — ныркі, трэці сутыкнецца з паражэннем мышачнай сістэмы.

***— Ці цалкам аднаўляюцца пасля ковіду лёгкія і як хутка гэта адбываецца? Што трэба рабіць, каб яны аднавіліся?***

— Эфектыўнасць рэабілітацыі пасля COVID-19 залежыць ад шматлікіх фактараў. У прыватнасці, ад ступені пашкоджання тканак, стану імуннай сістэмы, індывідуальных асаблівасцяў арганізма, узросту, наяўнасці спадарожных ускладненняў, якія змянілі работу лёгкіх пасля COVID-19.

У большасці выпадкаў аднаўленчая тэрапія дазваляе атрымаць станоўчую дынаміку за некалькі тыдняў. Але калі пацыент не выконвае рэкамендацыі ўрача і спрабуе замяніць прыём аптэчных прэпаратаў народнымі рэцэптамі, на станоўчы вынік разлічваць не выпадае.

На шчасце, пры няцяжкім цячэнні, часцей за ўсё пасля выздараўлення рэнтгеналагічная карціна вяртаецца да нормы, а функцыя лёгкіх аднаўляецца цалкам.

Аднак можа быць і іншы варыянт: у чалавека ўжо няма інфекцыі, ён адчувае сябе добра, але на кантрольным рэнтгеналагічным даследаванні ёсць, напрыклад, рэшткавыя міжтканкавыя змены або ўчасткі фіброзу. Міжтканкавыя змены — гэта «рэшткі» запалення, якія патрабуюць больш доўгага часу для аднаўлення менавіта таму, што гэтая пнеўманія асаблівая. Запаленне закранае не толькі ўнутрыальвеалярную прастору, гэта значыць, саму дыхальную паверхню лёгкіх, але і пранікае глыбей, у злучальнатканкавы каркас лёгкіх, і менавіта таму аднаўленне праходзіць больш павольна.

Лёгкія — орган парны, з высокай кампенсаторнай здольнасцю, таму калі нават фарміруюцца нешырокія, лакальныя ўчасткі фіброзу, функцыя можа не пацярпець. А значыць, адновяцца і эластычнасць, і газаабмен.

І можа быць трэцяя, самая цяжкая сітуацыя, калі застаюцца і істотныя рэнтгеналагічныя змены, і значныя функцыянальныя, захоўваецца зніжэнне насычэння крыві кіслародам, што праяўляецца задышкай, слабасцю, зніжэннем пераноснасці фізічных нагрузак. Як правіла, гэта бывае ў тых выпадках, калі ўсё ж такі фарміруюцца шырокія ўчасткі пнеўмафіброзу, якія закранаюць да 50 % лёгкіх і больш. У такіх выпадках спатрэбіцца доўгае і пільнае дынамічнае назіранне, магчыма, паглыбленае абследаванне і, што вельмі важна, паступовая, настойлівая, метадычная рэабілітацыя — фізічныя трэніроўкі, асаблівая дыхальная гімнастыка, паўнавартаснае харчаванне, абавязковая карэкцыя лячэння спадарожных хранічных захворванняў, пры неабходнасці дадатковая медыкаментозная і немедыкаментозная тэрапіі.

Пры гэтым вельмі важна абмеркаваць з урачом праграмы рэабілітацыі і дыхальнай гімнастыкі. Тут нельга рабіць такія практыкаванні, якія павялічваюць унутрыгрудны ціск. Напрыклад, надзіманне шарыкаў (якое ўсе прывыклі лічыць добрай трэніроўкай для лёгкіх) катэгарычна не падыходзіць для рэабілітацыі пасля COVID-пнеўманіі, таму што менш эластычная тканка лёгкіх, у якой запаленне яшчэ не цалкам прайшло, можа дадаткова траўміравацца.

***— Сэрца — адна з галоўных «мішэняў» для COVID-19. Раскажыце пра магчымыя наступствы і ў якіх выпадках трэба звяртацца да ўрача?***

— Пры COVID-19 узнікае паражэнне ўнутранай сценкі сасуда — эндатэлію. Гэта правакуе парушэнне такіх уласцівасцяў крыві, як цякучасць, вязкасць, пасля чаго развіваюцца трамбозы.

Практыка паказвае, што ў выніку сасудзістых парушэнняў у адных пацыентаў пасля хваробы падымаецца ціск, у іншых — наадварот, ён становіцца нізкі, у трэціх — адбываюцца парушэнні сардэчнага рытму. Віды сардэчна-сасудзістых ускладненняў шырока вар'іруюцца: арытміі, інфаркт міякарда, сардэчная недастатковасць, востры каранарны сіндром і іншыя.

Сярод шпіталізаваных пацыентаў частата арытмій, што сустракаюцца, складае каля 17 %, а ў хворых, якія знаходзяцца на ШВЛ, яна ўзрастае да 44 %. Калі чалавек выпісваецца з бальніцы пасля ковіднай інфекцыі з аналізамі, у якіх ёсць значныя адхіленні ад нормы, урач звычайна рэкамендуе паўторна зрабіць гэтыя аналізы праз адзін-тры месяцы. У тых выпадках, калі вынікі застаюцца дрэннымі, трэба звяртацца да медыкаў па дапамогу.

***— Якія наступствы бываюць для нервовай сістэмы?***

— Каля 37 % пацыентаў пасля ковіду сутыкаецца з неўралагічнымі парушэннямі — агульнымі і цяжкімі. Агульныя — гэта галаўныя болі, галавакружэнне, слабасць, млоснасць, астэнічныя расстройствы (перапады настрою, зніжаная працаздольнасць, стомленасць, парушэнні сну). Да цяжкіх неўралагічных ускладненняў адносяцца ішэмічныя інфаркты галаўнога мозга, кровазліянні, міеліты (паражэнні спіннога мозгу), палінейрапатыі (паражэнні перыферычнай нервовай сістэмы).

Нярэдкія парушэнні функцыі раўнавагі — вертыкальнага становішча цела ў прасторы — пасля таго як пацыент доўгі час праявёў лежачы. Знікненне пахаў таксама з'яўляецца неўралагічным ускладненнем, якое звязана з паражэннем нюхальных нерваў. Такім чынам, страта нюху — адна з прыкмет пранікнення віруса ў нервовую сістэму. Дарэчы, пацыенты з парушэннем успрымання пахаў схільныя да развіцця неўралагічных ускладненняў часцей за іншых.

***— Як доўга нюх можа адсутнічаць і ці варта турбавацца з-за гэтага?***

— Трэба сказаць, што анасмія — вельмі распаўсюджаны сімптом пры каранавіруснай інфекцыі. Пацыент можа не пакутаваць з-за закладзенасці носа ці высокай тэмпературы, у яго можа не быць сухога задушлівага кашлю. Але ён ужо хворы, проста пра гэта не здагадваецца. І ў такой сітуацыі дыягнастычнай прыкметай часта выступаюць пагаршэнне і адсутнасць нюху.

Праўда, сімптом характэрны не для ўсіх пацыентаў. Але калі ён выявіўся, трэба неадкладна звярнуцца па медыцынскую дапамогу і зрабіць тэст на каранавірус. Што цікава, пры COVID-19 анасмія часта развіваецца паступова. Гэта значыць, у першы дзень нюх трохі прытупляецца, а ўжо праз некалькі сутак праблема становіцца моцна выяўленай. Да поўнай страты здольнасці адрозніваць пахі даходзіць далёка не заўсёды.

Пры анасміі, выкліканай паражэннем «цыбулін» поласці носа, якія адказваюць за ўспрыманне пахаў, нюх вяртаецца параўнальна хутка. Ужо праз два-пяць тыдняў пацыенты пачынаюць успрымаць моцна выяўленыя пахі, а затым і больш слабыя. Як толькі інфекцыю ўдаецца перамагчы, усе адчуванні вяртаюцца. Праўда, некаторыя пацыенты адзначаюць, што доўгі час водары здаюцца скажонымі або з'яўляецца какасмія (парушэнне ўспрымання), прычым на асобныя віды ежы — самае крыўднае, што раней менавіта яна была любімай. Скардзяцца на агіду да мяса, кавы, некаторай садавіны.

Пры паражэнні аддзела галаўнога мозга, які адказвае за ідэнтыфікацыю пахаў, аднаўленне нюху расцягваецца на доўгі час. За гэты перыяд арганізм павінен рэгенераваць асобныя элементы ЦНС у поўным аб'ёме, толькі тады імпульсная праводнасць нармалізуецца. Ужо з'явіліся звесткі, што некаторыя пацыенты, якія перанеслі інфекцыю шэсць-сем месяцаў таму, толькі цяпер пачалі адчуваць пахі, няхай і не ў поўнай меры. Але таксама навукоўцы выказваюць апасенне, што ў некаторых людзей, якія перахварэлі, асабліва ў пажылых, анасмія незваротная.

***— Ці могуць у выніку перанесенага ковіду пацярпець ныркі? Як гэта своечасова заўважыць? На якія сімптомы звярнуць увагу?***

— Праблема захворванняў нырак пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі ў тым, што пачынаюцца змены, якія, як правіла, не суправаджаюцца пэўнымі праявамі і ніяк чалавека не турбуюць. Рэдка магчымы болевы сіндром у паяснічнай вобласці, таксама можа быць змена колеру мачы (яна становіцца чырвоная, колеру «мясных памыяў»), пацыент можа скардзіцца на яе адсутнасць (п'е столькі ж вадкасці, як і раней, а мачы няма). Часам у чалавека, які раней не адзначаў у сябе павышэння ціску, ён можа назірацца.

Гэта тыя змены, на якія пацыент можа звярнуць увагу. Аднак адсутнасць падобных сімптомаў яшчэ не сведчыць пра тое, што хвароба нырак не працякае схавана.

Заўважыць яе дапамагае агульны аналіз мачы, які вельмі важна здаць пасля хваробы. Лабараторныя паказчыкі, на якія ў першую чаргу звяртае ўвагу ўрач — наяўнасць эрытрацытаў і бялку. Пацыент з такімі зменамі ў аналізе мае патрэбу ў кансультацыі ўрача і даабследаванні. Таму вельмі важна пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі здаць агульны аналіз мачы і біяхімічны аналіз крыві, пажадана ў першы месяц пасля хваробы. Калі ўсё будзе добра, можна паўтарыць аналіз праз тры месяцы.

На працягу самой хваробы чалавек павінен падтрымліваць адэкватны водны баланс, асабліва калі ў яго высокая тэмпература, павышанае потааддзяленне. Гэта сапраўды можа дапамагчы ныркам. Бо ўсе лекавыя сродкі пры лячэнні COVID-19 і яго ўскладненняў (супрацьвірусныя, магчыма, антыбіётыкі), таксама праходзяць праз нырку. Пры недахопе вадкасці ў арганізме канцэнтрацыя прэпаратаў у ёй будзе павышацца і могуць праявіцца пабочныя эфекты гэтых прэпаратаў.

***— Слабасць і задышка могуць мучыць тыдні і нават месяцы пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі. Задышка заўсёды сведчыць аб паражэнні лёгкіх?***

— Неабавязкова. Моцная задышка можа быць звязана таксама з паражэннем плеўры (плеўрытам), з уздзеяннем віруса на сардэчна-сасудзістую сістэму (міякардыты, перыкардыты), на цэнтральную і перыферычную нервовыя сістэмы. Задышкай можа праяўляць сябе любы паталагічны стан, які суправаджаецца недастатковай колькасцю кіслароду ў крыві, а таксама стрэс (напрыклад, праява трывожна-дэпрэсіўнага расстройства).

Калі пасля стацыянарнага ці амбулаторнага этапу лячэння COVID-19 праз два тыдні засталася толькі задышка — гэта не самы дрэнны зыход, асабліва калі яна з кожным днём становіцца ўсё менш выяўленай. Важна ацэньваць дадзены сімптом у дынаміцы: калі задышка не пагаршаецца, становіцца меншая (пры гэтым выключаны фактары паражэння сэрца), то гэта добры знак.

Варта адзначыць, што каранавірус, як і шэраг іншых узбуджальнікаў рэспіраторных інфекцый, здольны правакаваць у схільных да гэтага пацыентаў фарміраванне бранхіяльнай гіперрэактыўнасці. І гэта таксама неабходна ўлічваць пры захаванні задышкі, асабліва пры яе прыступападобным характары. У такой сітуацыі трэба праводзіць дыферэнцыяльную дыягностыку з бранхіяльнай астмай, для чаго рэкамендуецца выкананне спіраграфіі з функцыянальнымі пробамі і алергалагічнае абследаванне.

Калі задышка не праходзіць ці стан пацыента пагаршаецца, нягледзячы на выкананне медыцынскіх рэкамендацый, то мэтазгоднае выкананне пульсаксіметрыі — вымярэння сатурацыі (задышка можа быць праявай недастатковага ўзроўню кіслароду ў крыві). Тут патрэбны паўторны зварот да доктара і яшчэ адно абследаванне на прадмет выяўлення позніх ускладненняў захворвання.

Здаровым пацыентам варта мець на ўвазе, што задышка можа праявіцца нават праз некалькі месяцаў пасля перанесенай хваробы. Сярод магчымых яе прычын як паўторнае інфікаванне каранавірусам, так і мноства іншых захворванняў, якія не маюць нічога агульнага з COVID-19.

***— Ці небяспечная тахікардыя пасля дадзенага захворвання?***

— Падчас і пасля COVID-19 многіх непакояць скачкі пульсу і ціску, таму што вірус «садзіцца» на рэцэптары ў сэрцы і сасудах. Гэта не небяспечна (калі не суправаджаецца ўздымам тэмпературы і выяўленымі арытміямі) і потым праходзіць само. Калі часты пульс перашкаджае жыць, можна часова прызначыць таблеткі, якія зніжаюць частату сардэчных скарачэнняў. А калі не перашкаджае, то прымаць нічога не трэба.

Пасля перанесенага COVID-19, асабліва ў выпадку, калі захоўваюцца скаргі і ёсць трывожныя сімптомы, мэтазгодна прайсці комплекснае абследаванне: руцінныя лабараторныя аналізы і інструментальную дыягностыку, атрымаць кансультацыю тэрапеўта, каб мець аб'ектыўную інфармацыю аб стане арганізма, магчымых наступствах інфекцыі і пры неабходнасці — індывідуальныя рэкамендацыі па рэабілітацыі.

З людзьмі і сам-насам

# «І ЗІМОЙ, І Ў ЦЁПЛЫМ ЛЕЦЕ ХАЙ «ЗВЯЗДА» ЗАЎСЁДЫ СВЕЦІЦЬ!»

**Спытай, што такое грамадская думка, і людзі вучоныя — тыя ж гісторыкі, палітолагі, філосафы, юрысты — ну вядома, адкажуць... Што адметна — кожны па-свойму, але, відаць, аднолькава незразумела.**

**Іншая рэч — гумарысты. Паводле іх, грамадская думка — гэта думка людзей, у якіх не пыталіся. А яны, між тым, не проста выказваюць яе (дома на кухнях, у курыльнях, сацыяльных сетках...). Па старой і добрай традыцыі яны пішуць, у тым ліку: «Добрых дзён табе, дарагая «Звязда!».**

**У газеты (адзначым, з больш чым стагадовай гісторыяй!) для такіх вось зваротаў-лістоў і былі, і ёсць спецыяльныя рубрыкі, пісьмы чытачоў друкаваліся і друкуюцца на адмысловых старонках «Што людзі пішуць», «Зваротная сувязь» і зрэдку — у такіх вось аглядах.**

## ШТО ЗА ГРУЦА З ВЯРШКАМІ?

Для пачатку — «ланцужок». Адна жанчына (не так важна, хто і адкуль) у сваім лісце ў «Звязду» пісала, што неяк праз іх вёску праязджалі байкеры, што адзін з іх у мясцовай краме досыць доўга выбіраў цукеркі ды яшчэ і наракаў. Не, зусім не на смак (з гэтым, казаў, усё ў парадку)... На тое, што назвы іх даюцца па-руску. А яму — госцю нашай краіны — хацелася б завезці ў свой Піцер менавіта з адметнымі, беларускімі: дочкам малым расказаць пра наш край, яго землі-дарогі, яго прыгожую мову...

*«Якой, на вялікі жаль, амаль не бачыш не толькі на абгортках цукерак, але і на пакунках з іншымі прадуктамі, на іх цэнніках, — дадаваў у падтрымку ўжо іншы чытач газеты. — А яно ж як добра было б, каб назвы даваліся не толькі па-руску. Такім чынам, купляючы іх, спажываючы, людзі Беларусі не забываліся б — ведалі, што такое вяндліна, вяршкі, цыбуля, цукар, ялавічына, не блыталі б гарбузы з кавунамі».*

*«Мяне здзівіла,* — прыводзіў прыклад чытач, — *што ў тлумачальным слоўніку нашай мовы няма слова «пярлоўка». Прыйшлося паглядзець у руска-беларускі і праз яго даведацца, што па-нашаму гэтыя крупы называюцца панцаком альбо груцай...»*

*«Дзякуй за тое, што вынеслі на старонкі газеты гэтыя нашы родныя, ды, на жаль, амаль забытыя словы»,* — праз нейкі час прачыталі ў іншым лісце, з іншага кутка краіны.

Гэта — хіба адзін «ланцужок» як сведчанне таго, што думка, выказаная адным чалавекам, знаходзіць водгук у іншых. Прычым — не толькі на словах: не-не ды і з'яўляюцца на прылаўках тавары, дзе ўся інфармацыя падаецца па-беларуску. І не чуваць, дзякуй богу, каб гэтым хоць хто абураўся. Ва ўсякім разе ў нашай пошце лістоў на падобную тэму ў гэтым стагоддзі, здаецца, не было.

Якія былі? Чытайце.

## ЧАГО ХАЦЕЦЬ ПЕНСІЯНЕРАМ

*«У «Звяздзе» я знаходжу вельмі шмат знаёмага, блізкага, перажытага некалі самім, з многім пагаджаюся,* — піша **спадар Аляксандр Матошка з Расоншчыны.** — *Ну вось з нядаўняга: у час татальнага дэфіцыту, калі спадарыня Алена Ляўковіч прымудрылася «ўхапіць» сапраўдны скарб — ярка-чырвоную ватную коўдру» (гл. «Неасабісты суб'ектыў», «Звязда» ад 2.04), я працаваў у сапраўдным тагачасным пекле: размяркоўваў сярод людзей так званыя сацыяльна значныя тавары — халадзільнікі, пральныя машыны, мэблю, тэлевізары, ставіў у чаргу. Талоны, купоны, чэкі «Маёмасць» і «Жыллё», змена грошай...*

*Успамінаецца гэта як жудасны сон... Згодны: перамены ў жыцці патрэбныя, але не гвалтоўныя, не раптоўныя (ад іх, мне здаецца, дабра не чакай), а паступовыя і памяркоўныя, з захаваннем таго, што зроблена, таго, што ў нас ужо ёсць. Ідэальнага заканадаўства не мае, напэўна, ніводная з дзяржаў свету. Вось і ў нас так бывае, што прымаецца нейкі закон, выдаецца ўказ, а потым да яго пішуцца каментарый, тлумачэнне, інструкцыя...»*

*«На мой погляд,* — працягвае спадар Матошка, — *прававы дакумент павінен быць настолькі зразумелы і празрысты, каб яго можна было прымаць да выканання ў чыстым выглядзе, каб ён працаваў, не выклікаючы пры гэтым пытанняў.*

*Ну вось давайце пагаворым пра нашых пенсіянераў, якія па-ранейшаму працуюць.*

*Не спяшайцеся адмахвацца: маўляў, што пра іх гаварыць, яны атрымліваюць і пенсію, і зарплату — чаго ж яшчэ ім хацець? Мне здаецца — справядлівасці. Сапраўды, сёння з пенсіянерскіх заробкаў (найчасцей — невысокіх) робяцца адлічэнні ў адпаведны фонд: аднак чалавек, яго папаўняючы, узамен нічога не мае. Хоць на добры толк, як мне здаецца, не лішне было б зрабіць пераразлік яго пенсіі... Альбо ў адваротным выпадку з заробку пенсіянераў і з прадпрыемстваў-устаноў, дзе яны працуюць, адмяніць адпаведныя адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны. Тады гэта будзе зразумела і справядліва.*

*Не ў мяне аднаго ёсць пытанні па падатку на нерухомасць. Ну вось напрыклад: чалавек гадамі працаваў, атрымліваў большыя ці меншыя грошы, з іх плаціў падатак дзяржаве і адкладваў нейкія сумы на будаўніцтва дома альбо кватэры. Нарэшце, дамогся свайго: пераехаў у новае жытло... Апроч іншага, гэта значыць, што ён займеў нерухомасць, за якую зноў давядзецца плаціць падатак.*

*Ёсць пытанні і па нашым выбарчым заканадаўстве, зямельным, банкаўскім, па дзяржаўным страхаванні...*

*Закон павінен працаваць. Ён жа павінен мець юрыдычна-маральную раўнавагу: дзяржава = грамадзянін»,* — падсумоўвае спадар Матошка.

Працаваць павінен і чалавек, але... Тыя ж гумарысты кажуць, што работа — гэта месца, дзе можна зарабіць нервовы цік, стрэс, галаўны боль, інфаркт... І ў канцы месяца атрымаць грошы, каб набыць лекі.

У кожным жарце, як вядома, ёсць доля праўды, і як на сённяшні дзень, дык яна і ў тым, што да пералічаных даўно вядомых хвароб, якія можна атрымаць на рабоце, дадалася новая, небяспечная тым, што яе можна прынесці дадому, заразіць сваіх блізкіх.

*«У нас вядзецца барацьба з дармаедамі,* — піша **спадар Уладзімір Навуменкаў** з Мінска, — *з людзьмі, якія нідзе не працуюць. Іх, такіх вось неплацельшчыкаў падаткаў, абавязваюць аплачваць паслугі ЖКГ па іншых, павышаных тарыфах. Што, магчыма, і правільна, але ці заўсёды?..»*

Каб адказаць на гэтае пытанне, спадар Уладзімір прыводзіць канкрэтны прыклад. *«Мой знаёмы,* — піша ён, — *доўга працаваў інжынерам на заводзе, аднак пасля таго як ад ковіду ў 50 гадоў памёр яго сябар, звольніўся — пабаяўся захварэць сам і заразіць сваю сям'ю...*

*Так, гэты чалавек пакуль нідзе не працуе, — жыве за грошы, якія зарабіў раней, і я лічу, што яго нельга адносіць да катэгорыі дармаедаў. Ва ўсякім разе, пакуль не пойдзе на спад эпідэмія».*

*«Ды нават і без яе,* — працягвае спадар Уладзімір, — *бліжэй да 50—60 гадоў у многіх людзей з'яўляюцца праблемы са здароўем: ранейшая, часам вельмі цяжкая, напружаная работа становіцца не пад сілу, лягчэйшую ў такім узросце знайсці праблематычна... А вось нейкія зберажэнні ці істотная дапамога з боку дзяцей у чалавека, бывае, ёсць. Дык чаму б не даць яму магчымасць нейкі час пажыць не працуючы?*

Канкрэтныя прапановы ад спадара Навуменкава выглядаюць так: пакуль не скончыцца эпідэмія, зняць, што называецца, з парадку дня пытанне з дармаедамі. Гэта — раз, а два — не адносіць да іх людзей, якія маюць 30 гадоў дакументальна пацверджанага стажу... З усімі адсюль наступствамі.

Нешта ў гэтых прапановах, згадзіцеся, ёсць? Як і ў іншых пісьмах.

*«Здравствуй, дорогая «Звязда». Хочу обратиться к тебе за помощью».*

У чым яна спатрэбілася? Чытайце (у перакладзе і пераказе). **Спадарыня Наталля К.** зняла паказанні электралічыльніка, каб заплаціць за святло (чаго, як прызнаецца, не рабіла вельмі даўно)...

Не зрабіла і гэтым разам, бо ў яе ўзніклі сумненні. «Чаму такая вялікая сума? Можа, у мяне лічыльнік няспраўны? А калі так, то парайце, што рабіць? Памяняць, напэўна, дарага?»

Магчыма. Аднак чаму б адказ на гэтае пытанне не пашукаць на месцы? Сярод журналістаў (і «Звязды» ў тым ліку), безумоўна, ёсць людзі і дасведчаныя, і майстравыя, аднак яны не правяраюць і не мяняюць лічыльнікі (да таго ж за сотні кіламетраў ад Мінска). Яны (у кожнага свой «кірунак» — асвятляюць пэўныя тэмы: палітыку, медыцыну, культуру, адукацыю, спорт і г. д.) — рыхтуюць матэрыялы.

І гэта за шчасце, калі зробленае імі — патрэбнае, калі напісанае — чытаюць, шукаюць у той жа «Звяздзе» пэўныя рубрыкі і прозвішчы, калі гадамі, а то і дзесяцігоддзямі не здраджваюць ёй.

## «ГАЗЕТА ДОБРАЯ ЎСІМ...»

*«Звязда» мне засталася ў спадчыну, яе выпісваў тата,* — піша **спадарыня Ларыса Дзенісевіч** з Клічаўшчыны. — *Вось і я ўсё жыццё... 25 гадоў адпрацавала даяркай. Не мела, можна сказаць, ні водпускаў, ні выхадных, але ж, колькі помню сябе, з работы прыйду — пачытаю газету. Там цікавыя навіны, парады... Неаднойчы шчасціла мне і ў звяздоўскай латарэі. Некалі, помню, выйграла каляровы тэлевізар, потым — імпартны прас...*

*Карацей, як для чытача, дык «Звязда», мне здаецца, добрая ўсім!* — піша чытачка. — *Аднак цяпер на ўвесь наш сельсавет толькі адна пастаянная падпісчыца — гэта я. Не ведаю, як угаворваць іншых?*

Здавалася б, проста: расказваць аб тым, што прачытаў, што выйграў, нешта цікавае, як той казаў, пускаць па руках, а то...

*«Ад імя жыхароў сваёй вёскі і сябе асабіста,* — піша **Вольга Дзмітрыеўна Стаднік з Брэстчыны,** — *хачу выказаць шчырую падзяку карэспандэнту газеты Святлане Яскевіч за цудоўны артыкул «Школа, ФАП і нават раддом размяшчаліся ў хатах вяскоўцаў» (нумар «Звязды» за 27 сакавіка). Нам, вяскоўцам, вельмі прыемна, што пра наш Чэрск, які сёлета адзначыць свае 320 гадоў, прачытала ўся краіна, што напісалі пра яго на роднай беларускай мове...*

*Каб не толькі прачытаць артыкул (гэта можна і ў інтэрнэце), але і набыць для сябе патрэбны нумар, мае дзеці, іншыя жыхары Чэрска, нават святар нашага храма, абышлі ўсе кіёскі Брэста і знайшлі ў продажы толькі адзін экзэмпляр. Шкада, што такую цікавую газету не адшукаць у продажы, што яна выходзіць такім сціплым накладам».*

Шкада, заўважым, не толькі Вользе Дзмітрыеўне (цяпер, спадзяёмся, яна будзе выпісваць «Звязду»). Шкада іншым адданым чытачам-падпісчыкам і нам, супрацоўнікам газеты, шкада ўсім, хто хварэе за лёс краіны і мовы, бо сярод штодзённых — «Звязда» адзіная беларускамоўная... У што, як выглядае, многім нават не верыцца.

Прыклад? Калі ласка. *«Я пакуль вучуся ў школе, мару паступіць на факультэт журналістыкі,* — па электроннай пошце і па-руску піша **спадарыня Юлія М.** — *Для партфоліа (слоўка якое!) мне патрэбныя публікацыі. Прапаную вашай газеце свой матэрыял...»*

Адметнасць сённяшніх дзён, відаць, у тым, што яны запоўнены «ад і да»: гэта значыць, часу бракуе ўсім. Тым, хто збіраецца паступаць, — і пагатоў... Аднак перш чым накіроўваць свой матэрыял для публікацыі, можа, варта хоць нешта даведацца пра выданне? Ну хоць бы тое, на якой мове яно выходзіць, аб чым піша, як падрыхтаваць матэрыял спецыяльна для нашай газеты... Каб потым, паступіўшы, менавіта сюды прыйсці на практыку. Альбо — на сталую работу, бо прагноз вядомага кінагероя аб тым, што хутка не будзе ні кіно, ні тэатра, ні кніг, ні газет — адно суцэльнае тэлебачанне, пакуль не збыўся і, дасць бог, не збудзецца. А значыць, як піша **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч:**

*І зімой,*
*і ў цёплым леце*
*Хай «Звязда» заўсёды свеціць!*
*Знак падтрымкі,*
*Знак надзеі...*
*З ёй душою маладзеем!*

Дзякуй на добрым слове! А каб свяціла, пішыце. І, вядома ж, выпісвайце.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***P.S.*** Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, пошта прынесла яшчэ адзін досыць цікавы ліст. *«Чытаць я любіў са школы,* — піша **спадар Іван Букоўскі з Глыбоччыны.** — *Можа, таму, што на вачах быў прыклад бацькоў. Яны працавалі ў калгасе, лішніх грошай не мелі, аднак з кожнай палучкі з кнігарні прывозілі адну-дзве кніжкі.*

*Звычцы чытаць іх я не здраджваў і потым, у войску: у нашай вучэбцы была, як ні дзіўна, нядрэнная кніжная крама. У ёй за салдацкія тры з невялічкім рублі мы з сябрам Мішам Віннікам выбіралі па кніжцы, потым абменьваліся, бывала, што куплялі ў складчыну... І з жонкай потым, бывала, ледзь не палову зарплат аддавалі на кнігі. У савецкія часы выпісвалі шмат газет і часопісаў...*

*Незаўважна праляцелі гады і нават дзесяцігоддзі,* — *прызнаецца спадар Букоўскі. — І ўжо ўнук, прыязджаючы ў госці, любіць разглядаць старыя кнігі і фотаздымкі, слухаць мясцовыя легенды і паданні, просіць расказаць, чаму так называецца вёска, хутар. Ён жа неяк прапанаваў: «Дзед, а ты вазьмі і напішы, а я ўсё гэта зберагу».*

Гэта мы да чаго? Да таго, што ў сем'ях, дзе любяць чытаць, дзе шануюць кнігу, як правіла, вырастаюць добрыя дзеці.

***P.P.S.*** Смех смехам, а груца з вяршкамі, панцак — гэта сапраўды вельмі карысна і смачна. Пакаштуйце і параўнайце — згадзіцеся: пярлоўка (Васіль Быкаў, дарэчы, гэтае слова ўжываў) — трохі не тое.

БАНК РЕШЕНИЕ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 января 2021 г.

Наименование банка ЗАО Банк «Решение *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 6 841 | 7 748 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 | 16 598 | 15 300 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 1 | 12 607 | 16 949 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 2 | 29 706 | 21 915 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3 | 144 765 | 127 225 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 4 | 21 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 460 | 460 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6 | 20 695 | 19 415 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 7 | 432 | 541 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 8 | 1 556 | 1 712 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 18 | 207 | 179 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 9 | 4 974 | 6 419 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 238 862 | 217 863 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 10 | 9 944 | 9 307 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 10 | 159 972 | 145 077 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 11 | 13 661 | 10 030 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 4 | 2 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 12 | 2 385 | 2 409 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 185 964 | 166 823 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 14 | 35 988 | 35 988 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 16 | 719 | 406 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 15 | 12 916 | 12 978 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 16 | 3 275 | 1 668 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 52 898 | 51 040 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 238 862 | 217 863 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за 2020 год

Наименование банка ЗАО Банк «Решение» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 17 657 | 14 421 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 8 626 | 6 475 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 17 | 9 031 | 7 946 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 11 545 | 8 345 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 4 375 | 3 145 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 17 | 7 170 | 5 200 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 17 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 17 | (226) | 30 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 17 | 2 246 | 1 829 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 17 | 19 | (37) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 17 | 3 713 | 1 916 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 17 | 1 472 | 2 288 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 17 | 13 250 | 14 485 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 17 | 594 | 563 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 18 | 2 155 | 292 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 18 | 297 | (71) |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 1 858 | 363 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 19 | 126,7333 | 24,7288 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | | |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА
## за 2020 год

Наименование банка ЗАО Банк «Решение» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонд переоценки статей баланса | Всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2019 г. | 3011 | 35 988 | - | 208 | 1424 | 13 057 | 50 677 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 0 | - | 198 | 244 | (79) | 363 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 363 | - | 363 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 198 | (198) | - | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 0 | - | x | - | x | 0 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 0 | - | x | x | x | 0 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | - | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | | - | x | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 79 | (79) | 0 |
| 2.9 | прочие изменения (округления) | 30126 | 0 | - | 0 | - | - | |
| 3 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3013 | 35 988 | - | 406 | 1668 | 12 978 | 51 040 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3011 | 35 988 | - | 406 | 1668 | 12 978 | 51 040 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 313 | 1607 | (62) | 1858 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 1858 | - | 1858 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 313 | (313) | - | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | - | x | x | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 62 | (62) | - |
| 5.9 | прочие изменения (округления) | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2021 г. | 3013 | 35 988 | - | 719 | 3275 | 12 916 | 52 898 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ
## за 2020 год

Наименование банка ЗАО Банк «Решение» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 16 | 1858 | 363 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | - | - |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств и прочего имущества | 3012121 | | - | - |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| инвестиционного фонда Минстройархитектуры | 252 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 517 | 525 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 1 138 | 4 399 |
| в т. ч. денежные средства на депозитных счетах | 271 | 136 | 4 000 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| в том числе недостачи и потери | 281 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **52 178** | **58 367** |
| **БАЛАНС** | **300** | **59 393** | **61 756** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2020 г. | На 31декабря 2019 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 | 4 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 10 236 | 15 651 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **10 240** | **15 655** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 18 461 | 15 252 |
| в т. ч. инновационного фонда Минстройархитектуры | 511 | - | - |
| инвестиционного фонда Минстройархитектуры | 512 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 869 | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 937 | 3 757 |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| в том числе: курсовые разницы | 541 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **20 267** | **19 009** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| в т. ч. инновационного фонда Минстройархитектуры | 611 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 3 365 | 7 150 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 8 716 | 8 820 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1 234 | 337 |
| по авансам полученным | 632 | 7 379 | 4 461 |
| по налогам и сборам | 633 | - | 922 |
| из нее инновационному фонду Минстройархитектуры | 633а | - | - |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 8 | 8 |
| по оплате труда | 635 | 34 | 43 |
| по лизинговым платежам | 636 | 44 | 29 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | 3 020 |
| в том числе: | | | |
| в бюджет либо РУП «БЕЛСТРОЙЦЕНТР» | 637а | - | - |
| авансовые поступления в счет вкладов в уставной капитал | 637б | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 17 | - |
| в т. ч. инвестиционному фонду Минстройархитектуры | 638а | - | - |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | 16 717 | 10 949 |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| в том числе: курсовые разницы | 651 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 88 | 173 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **28 886** | **27 092** |
| **БАЛАНС** | **700** | **59 393** | **61 756** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2020 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2020 г. | За январь – декабрь 2019 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 9 350 | 5 651 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (3 266) | (2 563) |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | 6 084 | 3 088 |
| Управленческие расходы | 040 | (1 220) | (1 153) |
| Расходы на реализацию | 050 | (10) | (16) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050) | 060 | 4 854 | 1 919 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 13 056 | 10 195 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (14 241) | (3 752) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 - 080) | 090 | 3 669 | 8 362 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 291 | 269 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 28 | 1 |
| доходы от участия в уставных капиталах других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 263 | 268 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (21) | (14) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (21) | (1) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | (13) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 5 031 | 2 889 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 5 029 | 2 862 |
| из них списанные со счета 98 | 121а | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 2 | 27 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (7 918) | (2 523) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (29) | - |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (7 705) | (2 515) |
| из них списанные со счета 97 | 132а | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (184) | (8) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (2 617) | 621 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 1 052 | 8 983 |
| Налог на прибыль | 160 | (3 080) | (1 168) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 2 820 | (547) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | (2) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (11) | (2 700) |
| Прибыль (убыток), перераспределяемые в пределах юридического лица | 205 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 -160 ± 170 ± 180 - 190 - 200 ± 205) | 210 | 781 | 4 566 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 781 | 4 566 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель Трухан П.М.

Главный бухгалтер Н.Б. Гусева

25 марта 2021 г.

Суседзі

# НІЧОГА СВЯТОГА

## Чаму ў Польшчы апаганьваюць храмы?




**Днямі ў Варшаве адбыліся сутыкненні паміж пратэстоўцамі і паліцыяй, паведаміла інфармацыйнае інтэрнэт-выданне «Віртуальна Польска». Падзею можна б было палічыць шараговай, калі б не адна важная акалічнасць. Сутыкненні адбыліся падчас памятных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 11-й гадавіны гібелі ў авіякатастрофе прэзідэнта Польшчы. Паводле даных «Віртуальна Польска», пратэстоўцы спрабавалі сарваць цырымонію ўскладання кветак на магіле Леха і Марыі Качыньскіх пры ўдзеле кіраўніцтва краіны. Для стрымлівання актывістаў паліцэйскім прыйшлося прымяніць слёзатачывы газ. Некалькі чалавек былі затрыманы. На хвалі пратэстаў у суседняй краіне адбываюцца падзеі, раней неймаверныя, у грамадстве ўсё выразней выяўляецца раскол і, адпаведна, абвастраецца супрацьстаянне. Чаму так адбываецца?**

### Мяжа вар'яцтва пяройдзена

Па сутнасці, найбуйнейшая краіна Усходняй Еўропы падзелена на еўраарыентаваны (заходняя і паўночна-заходняя часткі Польшчы) і кансерватыўны (усход і паўднёвы ўсход) лагеры, заўважыла iz.ru. Дайшло да таго, што лідар кіруючай партыі «Права і справядлівасць» («ПіС») Яраслаў Качыньскі, якога ў краіне лічаць нефармальным кіраўніком дзяржавы, прызнаў, што ў Польшчы адбываецца «ціхая» грамадзянская вайна. Разважаючы пра апазіцыю ў асобе ліберальнай партыі «Грамадзянская платформа», Качыньскі абвінаваціў іх у мэтанакіраваным разбурэнні дзяржавы і традыцыйнай маралі. «Маральная рэвалюцыя, якая разбурае сям'ю, нацыянальныя традыцыі, усё, што вызначае нашу ідэнтычнасць, разбурае здаровы сэнс і самыя элементарныя правілы міжасобасных адносін, якія дазваляюць грамадству нармальна функцыянаваць», — падкрэсліў кіраўнік «ПіС».

Пры гэтым больш за 90 працэнтаў палякаў пазіцыянуюць сябе ў якасці хрысціян рымскага абраду. Храмы па-ранейшаму поўныя, і нават падчас пандэміі каранавіруса польскія каталікі наведваюць іх часцей, чым у многх іншых краінах Еўрасаюза. Але нягледзячы на гэта Польшча відавочна становіцца ўсё больш свецкай.



Даследаванне Варшаўскага інстытута дэмаскапіі, праведзенае летам 2019 года сярод польскіх студэнтаў, паказала, што вернікамі з іх лічаць сябе толькі 55 працэнтаў. У сярэдзіне 1990-х такімі называлі сябе тры чвэрці польскай моладзі. Відавочна, што грамадства змяняецца, і паступова традыцыйныя каталіцкія каштоўнасці страчваюць сваю прывабнасць.

У Польшчы праціўнікі хрысціянства асабліва актывізаваліся пасля таго, як Канстытуцыйны суд у мінулым годзе спрабаваў прыняць вердыкт аб узмацненні жорсткасці забароны абортаў. Найбуйнейшыя гарады краіны скалыналі шматтысячныя маршы пратэсту. Асаблівае раздражненне прыхільнікаў абортаў выклікае царква, якая падтрымлівае забарону. Пасля гэтага ў касцёлах на набажэнствах сталі з'яўляцца жанчыны з плакатамі «Памолімся за аборт». Характэрны інцыдэнт адбыўся летась напрыканцы кастрычніка: у горадзе Познань невядомыя напалі на царкву Святога Збавіцеля. Хуліганы размахвалі драўлянымі дубінкамі і выкарысталі слёзатачывы газ. Адзін з абаронцаў царквы атрымаў нажавое раненне.

Тымі ж днямі зламыснікі ўварваліся ў царкву святога Ота Бамбергскага ў Шчэціне, яны намалявалі на варотах касцёла чырвоную маланку (сімвал прыхільнікаў абортаў) і абчысцілі храмавую казну. Таксама вандалы «павесяліліся» ў касцёле Найсвяцейшай Крыві Ісуса ў Познані — апаганілі сцены храма абразлівымі надпісамі. Яшчэ адзін інцыдэнт быў зафіксаваны на могілках у вёсцы Бжэзуўцы Сілезскага ваяводства. Там усталяваны помнік ненароджаным дзецям, якія не з'явіліся на свет з-за абортаў. Бялюткую статую анёла з дзіцем на руках хуліганы аблілі чорнай фарбай.

«Чарговая мяжа вар'яцтва і грубасці пяройдзена. Я магу зразумець усю злосць і бездапаможнасць таго, што адбываецца вакол нас. Але не магу зразумець, хто і навошта павінен быў здзейсніць гэты акт вандалізму на муніцыпальных могілках у Бжэзуўцы. Гэты помнік — сімвалічнае месца для многіх з нас, дзе мы запальваем свечку і молімся за ненароджаных дзяцей», — з горыччу заўважыў мэр камуны Хале Гжэгаж Сікорскі.

### Абраза Панны

Напрыканцы мінулага года нядзельны дадатак Gazeta Wyborcza для жанчын «Высокія абцасы» справакаваў чарговы скандал. Напярэдадні Калядаў на вокладцы выдання з'явілася выява Панны Марыі, на твар якой надзета чорная маска з маланкай — сімвал антыўрадавых пратэстаў. Таксама Божая Маці трымала ў руцэ чорны парасон, які, зноў жа, з'яўляўся сімвалам дэманстрацый. Прадстаўнік канцылярыі прэм'ер-міністра Адам Андрушкевіч заявіў: «Шкада, што асяроддзе Gazeta Wyborcza не трывае людзей, якія вераць у Бога і Божую Маці, і абражае нашы пачуцці».

Дзікунства працягваецца і сёлета. Напрыканцы лютага невядомыя злачынцы паздзекаваліся са статуі Божай Маці, якая стаіць каля царквы Святых польскіх Першамучанікаў у Чэнстахове. «Рукі Панны Марыі былі адарваны і кінуты каля пастамента», — расказаў парафіяльны святар Станіслаў Ясіёнэк. Ксёндз дадаў, што прыхаджане будуць маліцца за апаганшчыка, які здзейсніў «такі зверскі акт, поўны нянавісці да святыняў». Ён не стаў падаваць заяву ў паліцыю, бо лічыць, што «справа не ў матэрыяльнай шкодзе, а ў маральнай — і паліцыя нам у гэтым не дапаможа».

У мінулым месяцы адбылося адразу некалькі падзей, звязаных з рэлігіяй. У сакавіку — жорсткі напад на парафіяльнага святара ў польскім мястэчку Вялікая Воля — Парадзіж. Старэнькі 69-гадовы ксёнз атрымаў сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні, уключаючы траўму галавы. Паліцыя па гарачых слядах затрымала злодзея. Ім аказаўся 47-гадовы мясцовы жыхар. «На ксяндза напалі, калі ён зачыняў вароты ў свой дом», — паведаміла прэс-сакратар раённага ўпраўлення паліцыі ў Апочне Барбара Стэмпень. Падазраванаму прад'явілі абвінавачанне ў замаху на забойства, а святара даставілі ў адзін са шпіталяў Лодзі.

І гэта не адзінкавы выпадак. Праз усяго некалькі дзён паліцыя затрымала двух жыхароў горада Жэшуў 18 і 20 гадоў, якія падазраюцца ў разгроме старога касцёла ў маёнтку Буведзуй. Па словах зламыснікаў, на вуліцы распіваць спіртныя напоі ім было холадна, таму яны зайшлі ў царкву. На пратэсты святара яны адрэагавалі агрэсіяй: збілі ксяндза, выбілі некалькі вокнаў, перакулілі лавы, галоўны і бакавы алтары. Святару ўдалося выбрацца, замкнуць хуліганаў унутры і выклікаць паліцыю.

У гэтыя ж дні грымнуў судова-рэлігійны скандал з пэўным адценнем. Крымінальная справа па арт. 196 КК РП («Абраза рэлігійных пачуццяў») была ўзбуджана яшчэ ў чэрвені 2020 года, калі ў радах шэсця секс-меншасцяў паліцыя заўважыла копію знакавай для палякаў іконы Чэнстахоўскай Божай Маці з вясёлкавым арэолам. За падобнае злачынства ў Польшчы пазбаўляюць волі на тэрмін да двух гадоў, аднак суд нечакана для пракуратуры ў мінулым месяцы вынес апраўдальны прысуд. На думку суддзі Агнешкі Вархол, стваральнікі «Вясёлкавай Багародзіцы» не здзяйснялі злачынства, звязанага з абразай рэлігійных пачуццяў, яны проста імкнуліся прадэманстраваць салідарнасць з ЛГБТ-супольнасцю. Прадстаўнікі Еўрапарламента адразу ж выказалі задавальненне рашэннем суда. Разам з тым журналісты высветлілі, што суддзя Агнешка Вархол, якая вынесла прысуд, з'яўляецца сужыцелькай актывіста ЛГБТ-руху, акцёра Марыуша Паганоўскага.

### Спрыяльная глеба для радыкалаў

Вядучы аналітык Агенцтва палітычных і эканамічных камунікацый Міхаіл Няйжмакаў параіў iz.ru звярнуць увагу, што на фоне пандэміі і абмежавальных мер пратэсная актыўнасць у многіх краінах прыняла радыкальны характар. «Прычым гэта датычыцца далёка не толькі пратэсту супраць уласна каранавірусных абмежаванняў і не толькі масавых акцый, але і радыкальных дзеянняў асобных грамадзян. Акрамя таго, канкурэнтныя агульнанацыянальныя выбарчыя кампаніі заўсёды ўзмацняюць палярызацыю ў грамадстве, а палітычнае жыццё краіны «ў перадвыбарным рэжыме» не заканчваецца ў дзень галасавання. У Польшчы прэзідэнцкая гонка лета 2020 года плаўна перацякла ў восеньскі палітычны крызіс, справакаваны абмеркаваннем правак у «Закон аб абароне жывёл», а пасля ў пратэсную кампанію ў сувязі з кастрычніцкім рашэннем Канстытуцыйнага суда з прычыны абортаў. Раздражненне на побытавым узроўні (у тым ліку з-за абмежаванняў у сувязі з пандэміяй) у спалучэнні з грамадскімі дыскусіямі па вострых тэмах, якія выклікалі канфлікты, і высокай ступенню палітычнай палярызацыі — спрыяльная глеба як для дзеянняў радыкальных палітычных актывістаў, так і для ўключэння ў такія канфлікты грамадзян, раней з падобнымі групамі не звязаных», — адзначыў Міхаіл Няйжмакаў.

У сваю чаргу, доктар палітычных навук, кандыдат гістарычных навук, прафесар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, саветнік прэзідэнта Расійскай асацыяцыі прыбалтыйскіх даследаванняў, эксперт Расійскага савета па міжнародных справах Наталля Яроміна заявіла iz.ru, што, па ўсёй бачнасці, польскае грамадства ўсё яшчэ праходзіць праз перыяд трансфармацыі і адаптацыі да новага саюза. «Выйшаўшы з сацыялістычнага лагера, Польшча з энтузіязмам улілася ў еўраатлантычны блок. Удзел у еўрапейскай інтэграцыі — гэта не толькі гранты з камунітарнага бюджэту (якія, дарэчы, Польшча атрымлівала ў найбольшых аб'ёмах у параўнанні з іншымі «навічкамі»), гэта яшчэ і палітычныя і, перш за ўсё, канкрэтныя прававыя абавязацельствы. Трэба прытрымлівацца ў нагу ў адзіным маршы з краінамі, якія прапагандуюць ліберальна-дэмакратычныя каштоўнасці, якія таксама некалькі трансфармаваліся за трыццацігадовы перыяд. Нядзіўна, што і палітыкі, і шараговыя грамадзяне шукаюць устойлівыя падставы для сваёй дзейнасці ўнутры краіны, а яна шукае сваё месца ў ЕС. Таму радыкалізацыя, як у асобе вельмі правых, так і вельмі левых, узмацняецца. Пры гэтым вельмі правыя маюць значна больш устойлівыя пазіцыі», — лічыць Яроміна.

У манеты два бакі: чым больш ашалела паводзяць сябе левыя і лібералы, тым мацней радыкалізуюцца правыя, заўважыла iz.ru. Пры гэтым многія з іх пераходзяць з традыцыяналісцкіх пазіцый на адкрыта нацыяналістычныя і нават неанацысцкія. Увесь гэты расклад яскрава дэманструе раздрай, які насамрэч інакш чым грамадзянскай вайной і не назавеш. І глабальны канфлікт усё больш становіцца некантраляваным. Раскол у польскім грамадстве працягвае ўзмацняцца і з часам здольны прыняць пагрозлівыя маштабы, у параўнанні з якімі цяперашнія канфлікты могуць падацца дробнымі непрыемнасцямі.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Даслоўна**

### «УВЕСЬ ГЭТЫ ШАБАШ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па знешнепалітычнай тэматыцы выказаўся аб адносінах з Польшчай, паведаміла БелТА.

«Нашы палітычныя кантакты з гэтай краінай ніколі не былі ідэальнымі. Але мы з прычыны свайго характару, менталітэту доўга мірыліся з асобнымі выпадамі і абвінавачаннямі ў свой адрас, стараліся знайсці кампраміс, праяўлялі гібкасць, разуменне. Мы зыходзілі з таго, што суседзяў не выбіраюць. І яны сапраўды ўсе важныя для нас», — сказаў Прэзідэнт.

«Але, аказалася, гэтыя канструктыўныя падыходы ў Варшаве ўспрымаюць як слабасць. Дэкларавaная яшчэ ў чэрвені мінулага года гатоўнасць польскага боку ісці нам насустрач па шэрагу напрамкаў змянілася абвінавачаннямі ў фальсіфікацыі выбараў, падтрымкай нашых цяперашніх збеглых і іх кампаній, прапанаваннем прыстанішча збеглым здраднікам і экстрэмістам, экстрэмісцкім інтэрнэт-рэсурсам. А потым справа дайшла да санкцый», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

«Уявіце: у чэрвені яны нам спявалі песні, прыемныя для слыху. І ў той жа час (мы ж гэта ўжо сёння ведаем) праз спецслужбы і іншыя структуры (ды і ў палітыцы) вялі іншую гульню — двайную гульню», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Апошняй кропляй, якая перапоўніла чашу цярплівасці, сталі непрыкрытыя спробы гераізацыі бандытаў і ваенных злачынцаў, правядзенне з гэтай мэтай мерапрыемстваў для беларускай моладзі ў Брэсце, ды і ў Гродне ўдзел дэструктыўнай групы этнічных палякаў пад кіраўніцтвам асобных дзеячаў так званай польскай эміграцыі ў несанкцыянаванай акцыі», — заявіў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што «ўвесь гэты шабаш» праходзіць у час 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «У краіне, якая страціла трэцюю частку насельніцтва. Прычым асабліва стараецца ў гераізацыі бандытаў Арміі Краёвай кансерватыўная партыя палітыканаў, якая імкліва страчвае падтрымку ў грамадстве. Значыць, гэта ўжо ўнутраная праблема ў Польшчы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.




Там, дзе марнеў пад снегам дол,
Вясна красуе ў новых строях.
Вясну чакалі ўсе вакол,
А больш за ўсіх чакалі двое.

Усё вакол для тых дваіх —
І сонца днём, і месяц ноччу,
І ціхі пошум хвой старых,
І звонкі жаўрукоў званочак.

І нават зорак галасы
Да іх здалёку далятаюць -
Там, у галактыках чужых,
Вясну таксама сустракаюць.

Там млечны шлях скрозь ноч вядзе,
Скрозь вечны час вядзе бясконца...
На ўсіх планетах, балазе,
Ёсць для дваіх вясна і сонца.



Прывіды беларускіх муроў

# КРЫВАВЫЯ СОСНЫ І НЯБАЧНАЯ ВАРТА

## Чаму Лідскі замак ахоўваюць загінулыя ў XIV стагоддзі ваяры

**«На схіле ўзгорка, нібы падпіраючы замак, растуць дзве даўгалетнія сасны. Яны захаваліся дзякуючы пашыранаму сярод гараджан і навакольных жыхароў перакананню, што яны выраслі не на раслінным соку, а на крыві».**
**Так пачынаецца адна з гісторый акадэмічнага зборніка беларускіх легенд і паданняў 1983 года. Пазначана, што ўзятая яна з часопіса «Wisla» за 1889 год.**
**«Здарылася гэта быццам яшчэ ў часы, калі ў Літве панавала язычніцтва. Прыйшлі сюды дзевяць манахаў-францысканцаў прапаведаваць хрысціянскую рэлігію. Аднак літвіны, не жадаючы прымаць хрысціянства, забілі гэтых місіянераў, а іх трупы ўкінулі ў яму на схіле Лідскага замка. На гэтым месцы, не сеяныя і не саджаныя, выраслі дзве сасны, якіх літоўцы, ужо стаўшы каталікамі, не чапалі. Але вось аднойчы хтосьці адсек галінку, і з яе выступіла кроў. З той пары ніхто ўжо не адважваўся ўзняць сякеру на гэтыя дрэвы...»**
**Гэта ўжо моцны містычны вобраз: дрэвы, з якіх цячэ кроў. А ў дадатак пачуеце ад экскурсаводаў гісторыю аб прывідных воях, якія і па сёння ахоўваюць Лідскі замак, а ўначы можна пачуць грукат зброі і гукі іх крокаў.**
**Наколькі легенды маюць пад сабой гістарычны падмурак?**



### Крыжакі на лідскім лёдзе

Адрэстаўраваны нядаўна Лідскі замак уражвае... Велічны, вялікі... Калі не прыглядацца да хібаў рэстаўрацыі, якія турысты скептычна ўвекавечваюць на смартфонах, накшталт шчарбата выкладзеных сучасных цаглін у аконных праёмах... Але, як пісаў слынны гісторык Міхал Ткачоў, «калі дакранаешся рукой да заімшэлых замкавых сцен, міжвольна думаеш: як жа людзі маглі тады, у далёкім дрымучым XIV стагоддзі, узвесці яго без механізмаў і машын? Любы сярэдні камень з кладкі сцяны важыць столькі, што яго ледзь адарвуць ад зямлі двое дужых мужчын. А колькі іх, такіх пасляледавіковых «гарошын», у сценах двухметровай таўшчыні! Самыя сціплыя падлікі паказваюць, што было сабрана і прывезена каля 23 000 $м^3$ валуноў. Кожны з іх трэба было падабраць адпаведна колеру, памеру і старанна абчасаць. А колькі «тварылаў» спатрэбілася, каб гасіць вапну! Ці ўзяць тую ж цэглу. Каля паўтара мільёна штук лягло іх у сцены, і праз шэсць з паловай стагоддзяў цэгла як звон — хоць у печ, хоць у падмурак!»

Давялося мне пабываць тут і падчас здымкаў фільма «Авантуры Пранціша Вырвіча», калі стваралася атмасфера XVIII стагоддзя. Тады ноччу ў святле поўні і пражэктараў сцены замка штурмавалі каскадзёры, у двары адбывалася крывавая бойка, а пасля там жа гуло баляванне... Магчыма, нейкія прывідныя вочы і назіралі за гэтым дзействам? Вочы, прывычныя да крывавых бітваў...

Міхась Ткачоў так пісаў у сваім артыкуле пра Ліду: «Першы яе князь быў Альгерд. Пры ягоным сыне Ягелу паміж літоўскімі князямі пачаліся доўгія звады за велікакняжацкі прастол. Гэта скарысталі крыжакі. У 1384 годзе, пасля працяглай аблогі і штурму, яны ўзялі замак і часткова яго разбурылі. У снежні 1392 годзе атрады рыцараў на чале з камандорамі Янам Румпенгаймам, Конрадам Ліхтэнштэйнскім ды іх саюзнікам князем Вітаўтам пераправіліся ля м. Аліта цераз Нёман і праз скаваныя маразамі балоты падышлі да лідскіх сцен. Разам з імі паспытаць рабаўнічага шчасця прывалакліся і англійскія рыцары, якіх узначальваў малады граф П. Нартумберленскі.

Запаліўшы падзамча і абрабаваўшы горад, драпежнікі аблажылі замак. Князь Дзмітрый Карыбут, што кіраваў абаронай, меў даволі сілы, але, напалоханы рыцарамі, вырашыў здаць замак. Прычакаўшы ночы, князь з гарнізонам пакінуў крэпасць і падаўся ў бок Навагрудка. Рыцарам дасталася шмат зброі і ваеннага рыштунку».

Паводле легенды пра Лідскі замак, згаданы Дзмітрый Карыбут, каб яго ўцёкі з войскам засталіся незаўважнымі, пакінуў на сценах замка некалькі вояў, якія мусілі прыкрываць адыход асноўнага гарнізона. Вось яны, фактычна смяротнікі, і баранілі замак да апошняга. Бароняць і пасля смерці.

Згадзіцеся, гістарычная падстава для ўзнікнення легенды аб прывіднай варце ёсць.

### Адкуль узяўся Карыбут?

Пацвярджаюць такія звесткі і матэрыялы знаўцы гісторыі Лідчыны Міхала Шымялевіча, які друкаваў артыкулы пра родныя мясціны яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады. У яго ж удакладнім, адкуль у Лідзе ўзяўся баязлівы князь Дзмітрый Карыбут. Лідчыну князь Альгерд аддаў свайму ўлюбёнцу Вайдылу. Вось як пра таго піша летапіс Быхаўца: «Некто пан был холоп у великого князя Ольгерда, паробок невольны, звали его Войдылом, первие был пекарь, потом уставил его постелю слати и воду давати себе питии, а потом и вельми полюбился ему и дал был ему Лиду держати и повел был его у доброе». Пасля смерці Альгерда Вайдыла так схіліў да сябе яго сына Ягайлу, што той надзяліў былога прыслужніка баярскім званнем і аддаў за яго замуж родную сястру Марыю. Супраць гэтага паўстаў Ягайлаў дзядзька Кейстут, бацька Вітаўта...

Ну, папраўдзе, варажнеча пачалася не толькі за Вайдылы, як піша Шымялевіч, «Кейстут, празнаўшы аб заключаным супраць яго саюзе паміж Ягайлам і крыжакамі, раптам напаў на Вільню, схапіў Ягайлу, а сябе абвясціў вялікім князем».

Вось тут і з'яўляецца Карыбут: «Князь ноўгарад-северскі Зміцер Карыбут, родны брат Ягайлы, заступіўся за апошняга і пачаў пагражаць Кейстуту. Кейстут выступіў супраць Карыбута і па дарозе ў яго ўдзел напаў на Дуброўню, за 5 вёрст ад Ліды, схапіў тут Вайдылу і загадаў яго павесіць у 1381 г. (Danilowicz. Skarbiec Diplomotow. I. № 477, заўв. 8 )».

Пасля смерці Вайдылы Лідчына дасталася Ягайлу, а той у 1391-м аддаў Ліду вернаму брату, Дзмітрыю Карыбуту.

Але якраз у студзені наступнага года і адбылося нападзенне крыжакоў. І зусім невыпадкова ў шэрагах аддзела нямецкіх рыцараў знаходзіўся князь Вітаўт. Шымялевіч удакладняе, што той аддзел, «перайшоўшы па лёдзе каля м. Аліты р. Нёман, нечакана з'явіўся ля сцен Лідскага замка, спаліў прылеглую да яго частку горада і запатрабаваў здачы яго Вітаўту. Застрашаны першымі дзеяннямі рыцараў, Зміцер Карыбут у глухую поўнач спешна выступіў са ўсім сваім аддзелам з замка, пакідаючы яго без бою Вітаўту, і накіраваўся ў Наваградак».

Атрымліваецца, што князь, які кінуў сваіх смелых вояў на верную смерць, уладарыў замкам менш чым год, а войска, што той замак асаджала, вяртала замак Вітаўту, сыну Кейстута, стрыечнаму брату Ягайлы і Дзмітрыя Карыбута. Згадаем яшчэ, каб падсвятліць шэкспіраўскія жарсці падзеяў, што ў 1382 годзе, на другі год пасля таго, як Кейстут павесіў Вайдылу, ён сам быў забіты па загадзе пляменніка Ягайлы ў Крэўскім замку, а яго сын Вітаўт тады цудам уцёк...

Пасля таго як Ліда дасталася Вітаўту, Ягайла падпісаў з ім умовы вечнага міру. Дзмітрый Карыбут патрабаваў Ліду назад, нават сабраў наёмнае войска — але быў ушчэнт разбіты, трапіў у палон, але яго не замардавалі, як Кейстута. Няўдалы ўладальнік Лідскага замка быў адасланы да брата Ягайлы.

Ткачоў адзначае яшчэ цікавы факт: захаваліся руіны паўночна-ўсходняй вежы, якая была ўзведзена, магчыма, якраз у часы нападу крыжакоў, калі тыя ў 1384-м часткова зруйнавалі замак. Пры вывучэнні кладкі ў даследчыкаў склалася ўражанне, што будаўнікі вельмі спяшаліся, відаць, чакаючы чарговага нападу.

А ў Лідзе засталася легенда, якая адлюстроўвае сумніўныя паводзіны нядоўгага гаспадара.

### Крывавыя сосны

А вось што датычыцца крывавых соснаў...

Гісторыкі Ірына Масляніцына і Мікола Багадзяж прапанавалі цікавую гіпотэзу, што Ліда, паводле мясцовай легенды, сапраўды названа ў гонар старэйшай дачкі князя Гедыміна, якая ў хрысціянстве атрымала імя Лідзія. Пра гэта не захавалася звестак у гістарычных хроніках, але месцічы запомнілі. А хрышчана князёўна была, верагодна, перад сваім замужжам з праваслаўным князем Давыдам Гарадзенскім місіянерамі, якія, несумненна, прысутнічалі ў Лідзе. Па версіі гісторыкаў, пасля таго, як дачка Гедыміна загінула ад рук крыжаносцаў, і прынеслі людзі Гедыміна ў ахвяру паганскім багам місіянераў-ордэнцаў, развесіўшы на соснах каля замка.

Міхась Шымялевіч у сваім артыкуле, надрукаваным у «Виленском календаре» 1906 годзе, сцвярджаў наступнае: «Каля 1330 г. у Рускім краі, на правым узбярэжжы р. Нёмана, і Васкрасенскі летапіс і хроніка Стрыйкоўскага ў першы раз згадваюць імя літоўскага горада Ліды (Полное Собр. Рус. Лѣт., VIII, Воскрес., 240; Stryjkowski, I, 381.). Хоць імя Ліды датуль ні ў адной з першакрыніц і не сустракаецца, але несумнеўна, што селішча гэта належыць да ліку найстаражытных селішчаў літоўцаў і існавала ўжо ў X ст., г. зн. да таго часу, калі Рускі край не быў яшчэ ў валоданні рускіх князёў. На гэтую акалічнасць паміж іншым паказвае літоўскае паходжанне самой назвы «Ліда», якая азначае ў перакладзе на рускую мову — лясныя пацярэбкі, пчальнік, наогул мясцовасць, вычышчаную ад росшага на ёй лесу (Narbutt, Dzieje, V, дадат. I.)» Міхась Ткачоў пацвярджае: «Ліда», «лідзімас» (блізкае да яго славянскае «ляда») — таксама балцкае слова і азначае месца, расчышчанае і раскарчаванае ад лесу».

Наконт пакарання місіянераў Міхал Шымялевіч расказвае наступнае... У часы княжання Гедымінавага сына Альгерда адзін з літоўскіх вяльможаў па імені Гаштольд прыняў хрысціянства і ўзяў пад сваё заступніцтва манахаў ордэна св. Францішка, пабудаваў ім у Вільні кляштар. Дзякуючы гэтаму ў 1366 годзе тры францысканцы пасяліліся ў Лідзе. «Невядома, наколькі паспяховыя былі пропаведзі лідскіх місіянераў, вядома толькі тое, што ў 1369 годзе, падчас народнага хвалявання, яны былі перабітыя язычнікамі».

Ці не гэтую падзею захавала людская памяць?

Вядома, сосны, на якіх, паводле легенды, павесілі місіянераў, наўрад захаваліся. Але вельмі падобна, што ў легенды рэальныя падставы.

*На цівунскім полі*
*Камяні цягалі,*
*А з тых каменняў*
*Муры будавалі.*
*Вежа паднялася*
*Над самай вадою,*
*Дзе мой слаўны сокал*
*Засеў за сцяною...*

Гэтую старажытную беларускую песню Міхась Ткачоў прыводзіць як доказ, што велічны Лідскі замак будавалі менавіта мясцовыя жыхары, а не запрошаныя майстры.

Калі не былі там — з'ездзіце... І прыслухайцеся: ці не пачуеце крокі прывіднай варты?

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество**
**«Банк роста и развития бизнеса»**

220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18

**www.rrb.by**

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 21 622 | 7 914 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 | 42 055 | 57 442 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3 | 28 935 | 20 084 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 4 | 39 338 | 16 713 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 259 573 | 185 423 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 6 | - | 217 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 7 | 25 514 | 21 227 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 8 | 187 | 542 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 9 | 1 | 29 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 10 | 4 477 | 5 916 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 421 702 | 315 507 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 11 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 12 | 15 993 | 448 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 13 | 340 414 | 236 161 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 14 | 13 610 | 30 396 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 15 | 2 527 | 994 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 372 544 | 267 999 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 16 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 17 | 8 758 | 6 017 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 18 | 9 452 | 8 038 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 19 | 10 519 | 13 024 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 49 158 | 47 508 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 421 702 | 315 507 |

Форма 2

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 2020 год

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 20 | 23 473 | 16 454 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 20 | 17 175 | 10 705 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 20 | 6 298 | 5 749 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 21 | 9 118 | 7 972 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 21 | 1 701 | 1 068 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 21 | 7 417 | 6 904 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 22 | (226) | (85) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 23 | 6 915 | 4 027 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 24 | 312 | 203 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 25 | 5 594 | 2 745 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 26 | 1 760 | 3 984 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 27 | 15 762 | 14 379 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 28 | 860 | 303 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 260 | 3 355 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 28 | 614 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 232 | 2 741 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | (0,0001) | 0,0210 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Форма 3

## ОТЧЕТ об изменении собственного капитала за 2020 год

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2019 г. | 3011 | 20 429 | - | 5 615 | 13 106 | 6 218 | 45 368 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 402 | (82) | 1 820 | 2 140 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 2 741 | 1 832 | 4 573 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 402 | (402) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | - | (2 434) | x | (2 434) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (2 434) | x | (2 434) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 12 | (12) | - |
| 2.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | 1 | - | 1 |
| 3 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3013 | 20 429 | - | 6 017 | 13 024 | 8 038 | 47 508 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3011 | 20 429 | - | 6 017 | 13 024 | 8 038 | 47 508 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 2 741 | (2 505) | 1 414 | 1 650 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 232 | 1 418 | 1 650 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 2 741 | (2 741) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | - | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 5 | (5) | - |
| 5.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (1) | 1 | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2021 г. | 3013 | 20 429 | - | 8 758 | 10 519 | 9 452 | 49 158 |

Приложение к отчету об изменении собственного капитала

## СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе за 2020 год

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 19 | 232 | 2 741 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 1 418 | 1 832 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств и прочего имущества | 3012121 | 18 | 1 418 | 1 832 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 1 650 | 4 573 |

Форма 4

## ОТЧЕТ о движении денежных средств за 2020 год

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 г. | 2019 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | 30 | 22 631 | 16 294 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | 30 | (17 650) | (9 820) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | 30 | 9 138 | 8 008 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (1 675) | (1 066) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (226) | (85) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | 30 | (3 206) | 5 012 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | 30 | 841 | (14) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | 30 | 2 857 | 4 631 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | 30 | (16 399) | (10 978) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | 30 | (587) | (502) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | (4 276) | 11 480 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (660) | (894) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | 30 | (4 114) | (2 728) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (23 858) | 4 159 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | 30 | (43 802) | (56 278) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | 32 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | 30 | 1 523 | 2 311 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (70 911) | (53 398) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | 30 | 14 649 | (2 320) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | 30 | 69 127 | 62 672 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | 30 | (17 006) | 14 885 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 428 | (1 179) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 67 198 | 74 058 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (7 989) | 32 140 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (4 164) | (1 515) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | 30 | - | 426 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | 30 | | (106 880) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | 30 | 7 946 | 106 880 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | 3 782 | (1 089) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | 30 | - | (2 437) |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | - | (2 437) |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 5 794 | (2) |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 1 587 | 28 612 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 75 974 |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 77 561 | x |

И.о.Председателя Правления,
Заместитель Председателя Правления Д.В. Клименков

Главный бухгалтер Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 22 марта 2021 г.

**Полная версия годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности размещена на сайте www.rrb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 22 июня 2020 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.

---

Grant Thornton
An instinct for growth

ООО «Грант Торнтон»
пр-т Победителей, 103,
оф. 507, 220020, г. Минск,
Республика Беларусь
УНП 100024856,
ОКПО 37384691
IBAN BY89ALFA30122723880010270000 BYN
БИК – ALFABY2X
ЗАО «Альфа-Банк»,
Адрес банка: ул. Сурганова,
43-47, 220013, г. Минск
Тел. +375 17 308 70 81 (82)
e-mail: info@by.gt.com
www.grantthornton.by

22.03.2021 № 91/21-з
На №__________ от ______________

г-ну Клименкову Д. В.
И.о. Председателя Правления

Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса»
ул. Краснозвездная, 18, г. Минск, 220034, Республика Беларусь

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

**Реквизиты аудируемого лица:**
**Наименование:** Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса» (сокращенное наименование банка – ЗАО «РРБ-Банк»).
**Место нахождения:** Республика Беларусь 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18.
**Сведения о государственной регистрации:** Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 22 февраля 1994 года, регистрационный номер 37.
**УНП:** 100361187.

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности (далее – годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность) Закрытого акционерного общества «Банк роста и развития бизнеса» (далее ЗАО «РРБ – Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса на 01 января 2021 года, отчета о прибылях и убытках; отчета об изменении собственного капитала; отчета о движении денежных средств за 2020 год, примечаний к годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАО «РРБ-Банк» по состоянию на 01 января 2021 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2020 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

